ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 36-ы
№ 86 (2240)
31 кастрычніка 1967 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР



Якуб КОЛАС.

Лінагравюра Янкі РАМАНОЎСКАГА.

ПРЫСВЕЧАНА ЮБІЛЯРУ

Чарговае пасяджэнне кафедры літаратуры Гомельскага педагагічнага інстытута было прысвечана 85-й гадавіне з дня нараджэння народнага паэта рэспублікі Якуба Коласа. На пасяджэнні былі заслуханы даклады і паведамленні: «Роля Якуба Коласа ў развіцці беларускай літаратуры і культуры» — М. Янкоўскага, «Творчасць Якуба Коласа і дакастрычніцкая руская літаратура» — М. Малаўкі, «Якуб Колас і руская савецкая літаратура» — М. Родчанкі, «Якуб Колас і Украіна» — П. Ахрыменкі, «Якуб Колас і замежныя славянскія літаратуры» — В. Ахрыменкі, «Якуб Колас і пытанні выкладання літаратуры ў школе» — В. Лашкевіч. Былі абмеркаваны таксама тэзісы дакладаў і лекцый, прысвечаных жыццю і творчасці народнага песняра, якія будуць прачытаны членамі кафедры працоўным горада ў лістападзе.

У ПЯТНАЦЦАЦІ ТАМАХ

Дзяржаўны Камітэт Савета Міністраў БССР па друку прыняў пастанову аб выданні да 90-годдзя з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Якуба Коласа новага збору яго твораў. Выданне мяркуецца ажыццявіць у пятнаццаці тамах. Гэта будзе самае поўнае і прадстаўнічае навуковае выданне коласаўскай спадчыны. У зборы твораў упершыню будуць шырока прадстаўлены публіцыстычныя і крытычныя артыкулы паэта, многія старонкі яго дзённікавых запісаў, эпістолярная спадчына.

У «ДОМЕ КОЛАСА»

У гэтыя дні ў Доме-музеі народнага паэта Беларусі Якуба Коласа асабліва людна. Людзі розных узростаў — школьнікі і студэнты, калгаснікі і рабочыя, настаўнікі — прыходзяць сюды, каб, убачыўшы, як жыў і працаваў паэт, яшчэ глыбей адчуць і зразумець вытокі, веліч і харастро яго выдатных, неўміручых твораў, каб яшчэ глыбей зазірнуць у дзівосны свет яго натхнёнай паэзіі.

Да 85-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа ў доме-музеі абноўлены і папоўнены асобныя экспазіцыі. Адкрыта спецыяльная выстаўка — «Вольная праца нас адарае песняю радасных дзён». Тэма выстаўкі — «Якуб Колас і Кастрычнік». Яна расказвае аб тым, як расквітнела творчасць народнага паэта пасля Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, паказвае яго грамадскую і навуковую дзейнасць у савецкі час.

Беларусь ПЕРАД-СВЯТОЧНАЯ

ДА СВЯТА—ТЫДЗЕНЬ

Па ўсёй неабсяжнай краіне нашай, па ўсёй Беларусі ідуць апошнія падрыхтаванні да 50-годдзя Савецкай улады. Гэты тыдзень — самы адказны, насычаны, працавіты.

Вось якія паведамленні паступілі да нас у рэдакцыю.

АД ЗАЛПА «АЎРОРЫ» ДА КАСМІЧНЫХ ДЗЁН

Так называецца тэатралізаваны паказ, падрыхтаваны калектывам мастацкай самадзейнасці Гомеля. Ён адбудзецца на вуліцах і плошчах, у парках і скверах горада, у ім прыме ўдзел некальні тысяч чалавек.

Падобных масавых паказаў у Гомелі яшчэ не бывала. Не памятаюць на Гомельшчыне і такога выпадку, каб наваселле спраўлялі адразу 50 сельскіх клубаў. Прайшлі ўжо конкурсы на лепшую святочную праграму, пераможцы выступяць у заключных канцэртах. Асабліва цікавая праграма атрымалася ў Шаблоўскім сельскім клубе. Тэма яе — «Наша вёска за пяцьдзесят гадоў». У многіх калгасах праходзіць пасвячэнне моладзі ў хлебаробы.

У Добрушскім Доме культуры перагортваюць заключныя старонкі вуснага часопіса «Радзіма юбілейная». Кожная старонка яго прысвечана аднаму з этапаў у гісторыі нашай краіны і суправаджаецца тэматычным канцэртам.

Нямала зроблена і кінафікатарамі вобласці. У многіх кінатэатрах устаноўлена навейшая апаратура. У сельскай мясцовасці ўжо ёсць 200 шырокіх экранаў. А яшчэ ж нядаўна іх было 35. Але самае галоўнае, вядома, — работа з гледачамі. Яна стала цікавейшай, больш змястоўнай, шматграннай. У гомельскім кінатэатры «Кастрычнік», напрыклад, сістэматычна наладжваюцца сустрэчы з удзельнікамі рэвалюцыі і героямі Вялікай Айчыннай вайны, з пісьменнікамі і артыстамі.

Творчае парыванне, невычэрпную ініцыятыву, фантазію праявілі работнікі культуры, рыхтуючыся да кастрычніцкіх ўрачыстасцей.

ДЛЯ СВЯТОЧНЫХ ВУЛІЦ

Апошнія мазкі — і пано, прысвечанае рэвалюцыйным падзеям у нашай краіне, зойме сваё месца на адной з вуліц сталіцы.

Дзесяткі заказаў, звязаных з афармленнем горада, выканалі мінскія мастацкі-афармленчыя майстэрні.

ВЕЧНА ЖЫВЫЯ

На васемнаццаціметровай вышыні, уразаючыся ў неба, стаіць салдат. Ён стаяў насмерць, калі гітлераўскія каты ўварваліся на родную зямлю, ён пастаўлены тут на стагоддзі, як сімвал міру і жыцця. Сюды, да помніка, устаноўленага ў Бабруйскім раёне, увесь час прыходзяць людзі, тут заўсёды жывыя кветкі. Подзвіг героя не забыты, іх справы — адна з самых яркіх старонак у гісторыі нашай краіны.

Увекавечанню месцаў гістарычных і памятных падзей, гераічных подзвігаў савецкіх людзей была аддадзена асабліва ўвага ў перыяд падрыхтоўкі да юбілею. У тэтую работу ўключыліся скульптары, мастакі, архітэктары, мінскія мастацка-афармленчыя майстэрні. І вось за апошнія два гады на тэрыторыі Беларусі ўстаноўлена больш за сто помнікаў героям грамадзянскай і Айчыннай войнаў, салдатам і партызанам.

Трохфігурная кампазіцыя «Нескароныя» ўстаноўлена ў калгасе «Камуніст» Слуцкага раёна, помнік загінуўшым у гады вайны ўзведзены ў калгасе «Чырвоная змена» Любанскага раёна.

У будні і святы, у дні трывог і перамог заўсёды памятае народ аб тых, хто аддаў жыццё за яго шчасце.

РАСКАЖУЦЬ ЭКСПАНАТЫ МУЗЕЯ...

У бліжэйшы час адкрыецца музей акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі. На здымку (злева направа): артысты С. Друкер, М. Гульман і загадчыца літаратурнай часткі Б. Шарашэўская праглядваюць новыя метэрыялы.

ГЕРОІ П'ЕСЫ І ІХ ПРАВОБРАЗЫ

Вучні Магілёўскага культасветвучылішча працуюць над п'есай журналіста І. Ісачанкі «Факел».

Ды і каму, як не ім, зацікавіцца гэтым творам. Бо правобразам герояў п'есы стаў адзін з першых культасветработнікаў Магілёўшчыны — Федзя Ракушаў, арганізатар сельскай моладзі ў вёсцы, рэдактар першай сельскай рукапіснай газеты «Факел». Сярод дзеючых асоб — яго браты-камсамольцы Міхаіл і Рыгор, іх бацька — удзельнік дзвюх рэвалюцый і грамадзянскай вайны.

Перш чым пачаліся рэпетыцыі, удзельнікі спектакля сабралі вялікі матэрыял. Яны перапісваюцца з братам Федзі — Міхаілам Васілавічам Ракушавым, з яго сябрамі, якія жывуць цяпер у Ленінградзе.

Работа над спектаклем «Факел» завяршаецца. Хутка — прэм'ера. Яна адбудзецца ў вёсцы Міхінічы Круглянскага раёна, дзе жылі, змагаліся і загінулі ад рук ворагаў Фёдар і Рыгор Ракушавы, іх бацька-бальшавік Вавіла.

Юбілейным спектаклі, прысвечаным 50-годдзю Савецкай улады, адбыліся амаль ва ўсіх народных тэатрах і драматычных калектывах Магілёўшчыны.

З ВЫСОКАЙ УЗНАГАРОДАЙ!

За заслугі ў развіцці савецкай літаратуры і актыўны ўдзел у камуністычным выхаванні працоўных Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР Указам ад 28 кастрычніка 1967 года ўзнагародзіў ордэнамі і медалямі СССР групу дзеячоў савецкай літаратуры.

Сярод узнагароджаных—група пісьменнікаў Беларусі

ОРДЭНАМ ЛЕНІНА ўзнагароджаны празаік і драматург **Ілья Данілавіч Гурскі** і паэт **Максім Танк** (Яўген Іванавіч Скурко);

ОРДЭНАМ ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА—празаікі **Іван Паўлавіч Мележ** і **Іван Пятровіч Шамякін.**

□ □ □

За заслугі ў развіцці савецкага мастацтва, актыўны ўдзел у камуністычным выхаванні працоўных і шматгадовую плённую работу ва ўстановах культуры Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР Указам ад 27 кастрычніка 1967 года ўзнагародзіў ордэнамі і медалямі СССР групу работнікаў мастацтва і ўстаноў культуры.

У тым ліку па Беларускай ССР:

ОРДЭНАМ ЛЕНІНА—Глебава Аляксея Канстанцінавіча, народнага мастака Беларускай ССР, скульптара; **Ржэцкую Лідзію Іванаўну,** народную артыстку СССР, артыстку Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы; **Шырму Рыгора Раманавіча,** народнага артыста СССР, мастацкага кіраўніка Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы Беларускай ССР.

ОРДЭНАМ ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА — Алоўнікава Уладзіміра Уладзіміравіча, заслужанага дзеяча мастацтва Беларускай ССР, рэктара Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі; **Стому Здзіслава Францавіча,** народнага артыста Беларускай ССР, артыста Беларускага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы; **Цітовіча Генадзя Іванавіча,** мастацкага кіраўніка Дзяржаўнага народнага хору Беларускай ССР.

ОРДЭНАМ «ЗНАК ПАШАНЫ» — Бульчыка Сяргея Сцяпанавіча, народнага артыста Беларускай ССР, артыста Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра; **Уласава Юрыя Іванавіча,** заслужанага артыста Беларускай ССР, артыста Брэсцкага абласнога драматычнага тэатра імя Ленінскага камсамола; **Глебава Яўгена Аляксандравіча,** заслужанага дзеяча мастацтва Беларускай ССР, кампазітара; **Грыгар'янца Армена Багратавіча,** заслужанага дзеяча мастацтва Беларускай ССР, галоўнага мастака Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы; **Карповіч Веру Мікалаеўну,** старшага касцюмера Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларускай ССР; **Кімберга Якава Мікалаевіча,** заслужанага артыста Беларускай ССР, артыста Гродзенскага абласнога рускага драматычнага тэатра; **Кагадзеева Аляксея Пятровіча,** галоўнага хормайстра Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларускай ССР; **Мачуліна Рыгора Гаўрылавіча,** намесніка міністра культуры Беларускай ССР; **Савіцкага Міхаіла Андрэевіча,** мастака; **Янкоўскага Расціслава Іванавіча,** заслужанага артыста Беларускай ССР, артыста Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра Беларускай ССР імя М. Горкага.

МЕДАЛЕМ «ЗА ПРАЦОЎНУЮ ДОБЛЕСЦЬ» — Герасімовіч Эльвіру Пятроўну, інструктара ЦК КП Беларусі; **Капырыну Валянціну Васільеўну,** старшую манціроўшчыцу дэкарацый Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача; **Марусалава Міхаіла Міхайлавіча,** дырэктара Мінскага дзяржаўнага цырка; **Нікалаева Яўгена Дзмітрыевіча,** заслужанага дзеяча мастацтва Беларускай ССР, галоўнага мастака Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа; **Цвятаеву Ірыну Аляксандраўну,** педагога Мінскай сярэдняй спецыяльнай музычнай школы.

МЕДАЛЕМ «ЗА ПРАЦОЎНУЮ АДЗНАКУ» — Казлова Барыса Рыгоравіча, саліста Дзяржаўнага ансамбля танца Беларускай ССР; **Карнееву Ніну Аляксееўну,** артыстку Гомельскага абласнога рускага драматычнага тэатра; **Матусевіча Іосіфа Антонавіча,** заслужанага артыста Беларускай ССР, артыста Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа.

ПРЭМІІ ЛЕНІНСКАГА КАМСАМОЛА

Бюро ЦК ВЛКСМ прысудзіла прэміі Ленінскага камсамола 1967 года за творы літаратуры і мастацтва з уручэннем дыплома і медалі лаўрэата: кінаакцёру А. В. Баталаву—за стварэнне вобразаў савецкага маладога чалавека ў кінафільмах «Дарагі мой чалавек», «Ляцяць жураўлі», «Дзевяць дзён аднаго года» і іншых; Д. М. Гнаюку, салісту Кіеўскага тэатра оперы і балета,—за канцэртна-выканаўчую дзейнасць і актыўную прапаганду савецкай песні; скульптару Л. Н. Галаўніцкаму—за стварэнне скульптуры «Арлёнак»—помніка камсамольцам-героям Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны на Урале; мастаку Г. Э. Кролісу—за стварэнне серыі графічных работ аб савецкай моладзі; кіраўніку ансамбля песні і танца Маскоўскага гарадскога Палаца піянераў В. С. Локцеву—за вялікую работу па эстэтычнаму выхаванню падрастаючага пакалення; паэту Олжасу Сулейменаву—за кнігу вершаў «Добры час усходу»; кампазітару Мікісу Тэадаракісу (Грэцыя)—за песні мужнасці і свабоды, якія клічуць моладзь на барацьбу супраць прыгнёту, фашызму, за мір і лепшую будучыню; скрыпачу В. В. Траццякову, студэнту Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі,—за канцэртна-выканаўчую дзейнасць і высокае майстэрства, праяўленае на міжнародных і ўсесаюзных конкурсах; кампазітару М. Філіпу Жэрару, паэту Жаку Дрэжаку (Францыя)—за стварэнне песні «Кастрычнік», прысвечанай 50-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, а таксама цыкла песень аб барацьбе французскіх працоўных за свабоду і мір; Брэсцкаму абласному драматычнаму тэатру імя Ленінскага камсамола Беларусі—за спектакль «Брэсцкая крэпасць»; Узбекскаму дзяржаўнаму ансамблю народнага танца «Бахор»—за канцэртна-выканаўчую дзейнасць і прапаганду савецкага мастацтва.

НАРОДНЫ ПЯСНЯР

Восемдзесят пяць гадоў назад, гэткаю ж, як і цяпер, парою, калі «нікла жыццё ў чыстым лесе, агаляўся твар зямлі і ляцелі ў паднябессі з сумным крыкам жураўлі», у засценку Акінчыцы, што загубіўся ў лясістым кутку Стаўбцоўшчыны, у сям'і лесніка Міхала Казіміравіча Міцкевіча нарадзіўся сын. Назвалі хлопца Костусем. Хлопец рос на ўцеху бацькам, забаўляўся разам з братамі няхітрымі забаўкамі сялянскіх дзяцей, бегаў на рэчку, па грыбы ў лес, засвойваў грамату ў хатняга «дарэктара», і не думаў ніхто, не гадаў — ні тады, калі маленькі сынок лесніка слухаў матчыны калыханкі і дзядзькавы казкі, ні тады, калі аднойчы прачытаў бацьку «складна» пра вясну і атрымаў ад яго за гэта сярэбранага рубля, ні нават тады, калі выбіўся «ў людзі», стаў вясковым настаўнікам і надрукаваў у газеце свой першы верш «Наш родны край», — не думаў ніхто і не гадаў, што Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч стане песняром беларускага народа, сімвалам яго духоўнага ўзлёту, стане Якубам Коласам...

Якуб Колас...

Побач з гэтым імем заўжды паўстае імя Янкі Купалы. Ці лепш сказаць так: імя Якуба Коласа непарыўна звязана з імем Янкі Купалы. Не таму толькі, што яны аднагодкі, што абодва амаль адначасова пачалі араць занядбаную беларускую літаратурную ніву. Важней тое, што працавалі яны — поплеч; што «пакідалі дзве баразны» — на адным полі; што песні, якія папрасіліся з іх грудзей, гучалі суладна і знаходзілі шчыры водгук у сэрцы таго, каму былі адрасаваны, — у сэрцы паднявольнага, скрыўджанага, «пагарджанага веку» селяніна, у якога адабралі не толькі волю і долю, але і бацькаўшчыну і родную мову; што аднолькавая іх роля і значэнне ў гісторыі роднай літаратуры і культуры, у гісторыі росквіту нашага краю.

Значэнне таго, што зрабілі Янка Купала і Якуб Колас, цяжка пераацаніць. Як Пушкін у рускай літаратуры, Шаўчэнка — ва ўкраінскай, Міцкевіч — у польскай, Янка Купала і Якуб Колас сваёй творчасцю раскрылі і паказалі свету нацыянальны характар беларускага народа, і зрабілі яны гэта, абапіраючыся на шматвяковы фальклор роднага народа, на лепшыя традыцыі сваёй нацыянальнай літаратуры і на перадавыя традыцыі класічных літаратур — перш за ўсё рускай, польскай і ўкраінскай.

Іх песню збудзіла да жыцця рэвалюцыя 1905 года, якая дала магутны штуршок нацыянальна-вызваленчай барацьбе народаў царскай Расіі. Рэха першай рускай рэвалюцыі дакацілася і да Беларусі і паклікала лепшых сыноў краю да служэння Бацькаўшчыне і яе занядбанаму люду. Сярод гэтага сузор'я, што паўстала над краем, найярчэй ззялі зоркі Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Была і яшчэ адна зорка першай велічыні — зорка Максіма Багдановіча, якога тукнула Бацькаўшчына з далёкай Волгі матчынай песняй і спакутаванай душою.

Мусіць, у гэтым і шчасце нашай сучаснай літаратуры, што на пачатку яе станаўлення ў ёй працавалі гэтыя тры найвялікшыя і так не падобныя адзін на аднаго таленты. Утраіх яны зрабілі так многа, што мы і да гэтага часу яшчэ не ўяўляем ва ўсёй паўнаце веліч здзейсненага імі. Знаем адно: хай мінуцца і яшчэ многія дзесяцігоддзі, а святло гэтых трох зорак па-ранейшаму будзе асвятляць дарогу нашай літаратуры, даваць кірункі новым талентам.

Чым жа свеціць нам зорка Якуба Коласа?

Адказаць на гэта і лёгка, і цяжка.

Лёгка, бо пры адным успаміне пра Якуба Коласа паўстае перад табою нешта невыказна дарагое і да шчымлівасці ў сэрцы роднае і блізкае, тое, што было з табою ўсё жыццё. Кожны з нас выходзіў разам з Аленкай і Сцёпкам «на прасторы жыцця», захапляўся кемлівасцю і адвагай слаўнага партызанскага камандзіра дзеда Талаша, жыў — пакутваў, працаваў, радаваўся і смяяўся —разам з героямі незвычайнай самабытнай, каларытнай і музычнай «Новай зямлі», напаўняўся рамантычнай лірыкай «Сымона-музыкі», быў у палоне задушэўнай апавядальнасці і вялікай жыццёвай праўды трылогіі «На ростанях», задумваўся над глыбокімі філасофскімі пытаннямі «Казкі жыцця», пакараўся мяккаму лірызму і шчырай узнёсласці грамадзянскай лірыкі паэта.

Цяжка, бо Якуб Колас — гэта цэлы свет, свет дзівосна багаты і непаўторна прыгожы, свет, у якім месціцца родная зямля, родны народ і ты сам, і ты толькі схіляеш у пашане галаву перад тым, хто падараваў табе гэты свет.

Якуб Колас...

Упершыню ён падаў аб сабе голас вось гэтымі радкамі:

Край наш бедны, край наш родны!
Лес, балоты і пясок...
Чуць дзе крыху луг прыгодны...
Хвойнік, мох ды верасок.

* * * * * * * * *

Край наш родны, бедна поле!
Ты глядзіш, як сірата,
Сумны ты, як наша поля,
Як ты, наша цемната.

Ужо тут, у першым сваім вершы, падпісаным псеўданімам «Якуб Колас», паэт заяўляе аб сабе як аб песняры гэтага беднага краю і яго гаротнага люду. Паэт не адрываецца ад народа, гаворыць вуснамі і вобразамі народа. Павага да чалавека працы, сцвярджэнне чалавечай годнасці «цёмнага мужыка», яго права на лепшае, свабоднае і шчасліве жыццё — усё гэта было ўжо ў першым вершы песняра і ўсё гэта лагічна, заканамерна вяло яго да таго, каб праз нейкі час гнеўна кінуць у свет:

Я — мужык, а гонар маю.
Гнуся, але да пары.
Я маўчу, маўчу, трываю,
Але скора загукаю
«Стрэльбы хлопчыкі, бяры!»

Да канца дзён сваіх Якуб Колас заставаўся верным сваёму народу, да канца дзён сваіх шчыра служыў яму — кожным радком паэта і кожным учынкам грамадзяніна.

Сын бясправнага «пана сахі» і касы, ён стаў адным з першых і адным са слаўнейшых прадстаўнікоў беларускай савецкай інтэлігенцыі. Узгадаваны горам і бядою, змалку спазнаўшы горкі смак беспрасветнай сялянскай працы, ён узняўся да вышынь навукі і культуры, віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук рэспублікі, Дэпутат Вярхоўных Саветаў СССР і БССР, Член Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі. Буйны вучоны і выдатны грамадскі дзеяч... Шмат зрабіў ён для развіцця навукі, культуры і народнай гаспадаркі рэспублікі.

І мы зноў схіляемся ў пашане перад яго волатаўскай фігурай.

Сёння мы радуемся і ганарымся велічнымі поспехамі роднай літаратуры. Шырока і далёка ў свет пайшло наша беларускае мастацкае слова. Гэты сённяшні росквіт нашай літаратуры стаў магчымы і таму, што яна развівалася і развіваецца па яго запаветах.

Жывуць і доўга будуць жыць у нашай паэзіі яго паэтычныя традыцыі.

Стварыўшы шэраг апавяданняў, трылогію «На ростанях», «Казкі жыцця», Якуб Колас на доўгіядоўгія гады даў кірунак і нашай прозе. Ён — бацька нашай прозы. Каго б з сённяшніх празаікаў ні назваць — усё роўна, старэйшага ці маладзейшага пакалення, — пра кожнага з іх можна сказаць, што выйшаў ён з-пад шырокага крыла Коласа.

Выключнае месца ў гісторыі нашай літаратуры належыць яго «Новай зямлі». Крытыкі даўно адзначылі яе як першую вяху на шляху станаўлення беларускага рамана.

І, вядома ж, найвялікшая заслуга Якуба Коласа ў станаўленні і развіцці нашай мовы: ён прымусіў заззяць роднае слова ўсімі колерамі вясёлкі.

Цэлага паўстагоддзя Якуб Колас разам з Янкам Купалам стаяў на чале нашай літаратуры. Творчая спадчына песняра будзе вечнай крыніцай, адкуль новыя таленты не перастануць черпаць сваё натхненне. На велізарны мастацкі вопыт Якуба Коласа апіраюцца нашы сучасныя пісьменнікі ў сваіх наватарскіх пошуках, у сцвярджэнні перадавых эстэтычных прынцыпаў сацыялістычнага рэалізму. Яны вучацца ў Якуба Коласа шырокаму погляду на народнае жыццё, вялікай, беззапаветнай любві да роднай зямлі і роднага народа. Яны заўсёды бачаць яго перад сабой — шчодрага і мудрага настаўніка.

Народны пясняр...

Гэтыя словы замацаваліся за Якубам Коласам яшчэ да таго, як яму афіцыйна было нададзена званне народнага паэта Беларусі. Ён сапраўды народны — па змесце і па характару сваёй творчасці, у якой з вялікай сілай, прыгажосцю і паўнатой увасоблены характар, звычаі, гісторыя, побыт і дух беларускага народа. І як кожны народны паэт, Якуб Колас бессмяротны. Тое, што ён пакінуў нам, заўсёды будзе жыватворнай крыніцай дабраты, мудрасці, святла і радасці. Блізкія і далёкія нашчадкі будуць вечна ўдзячны паэту, які дзеля іх шчасця шчодра аддаў свой «песень дар — агонь душы і сэрца жар».

Брэст... Горад над Бугам, пачуўшы кананаду гарматных залпаў, ведае — гэта святочны салют. І яшчэ ён ведае, што калісьці такі ж самы гром на досвітку чэрвеньскага дня аддзяліў ад нас, савецкіх людзей, мірны час і азначыў пачатак вайны, якую народ назваў Вялікай Айчыннай.

Часта ўвечары гучыць кананада і ў будынку тэатра імя Ленінскага камсамола Беларусі—там, на сцэнічных падмостках, зноў і зноў, на кожным паказе драмы «Брэсцкая крэпасць», пачынаецца вогненны світанак 1941 года. Гледачы, многія з якіх нарадзіліся пасля Перамогі, зноў і зноў сустракаюцца з тымі, хто першым прыняў удар гітлераўскага вермахта. Вось ужо больш за шэсцьсот разоў афішы камсамольскага тэатра абвяшчалі, што ўвечары адбудзецца спектакль «Брэсцкая крэпасць».

— Мы ганарымся,—сказаў нашаму карэспандэнту дырэктар тэатра Леанід Паўлавіч Валчэцкі,— што з гэтага дня на афішы спектакля будзе ўказана: «Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола». Гэта, зразумела, радасная ўзнагарода, бо наш калектыў з першых дзён сваёй дзейнасці прысвяціў творчасць юнаму пакаленню. Практыка тэатра ў Брэсце паказала, што так званы «маладзёжны адрас» вельмі шырокі, і тое, што хвалюе юнака 1947-га года нараджэння, часта кранае сэрца і яго бацькі або старэйшага брата. Такая і «Брэсцкая крэпасць».

— Леанід Паўлавіч, мабыць у сувязі з радаснай падзеяй варта было б успомніць тых, хто быў стваральнікам маштабнага і выпрабаванага часам спектакля.

— Драматург і тэатр заключылі творчы саюз, калі п'еса ўжо існавала. У яе была трохі рытарычная назва «Цытадэль славы». Аўтар зноў сеў за пісьмовы стол. Вядома, як часам пакутліва ідуць «дапрацоўкі» і «пераробкі» п'есы. Не заўсёды «мірна» заканчваецца і сумесная калектыўная творчасць. Наша работа з К. Губарэвічам праходзіла ў асноўным у згодзе, хаця іншы раз—навошта грэх таіць?—былі і складаныя моманты: творчыя пошукі, як і непазбежныя спрэчкі, працягваліся амаль да самай прэм'еры.

Вялікую работу пры стварэнні сцэнічнага варыянта п'есы правёў пастаноўшчык спектакля заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Аляксандр Васільевіч Міроншы. Па яго парадзе і з яго дапамогаю К. Губарэвіч напісаў нанова некаторыя карціны. Рэжысёр шукаў выразнага гераічнага спектакля, у якім бы ўсё выглядала гранічна праўдзіва, пераканаўча і ў той жа час рамантычна.

Не ўсе акцёры ведалі вайну такой, якой яна была. Ім давялося навучыцца ўпэўнена насіць чырвонаармейскую форму, правільна валодаць зброяй. У руках артыста павінны былі стаць прывычнымі і армейскі кацялок і бінты. І да таго ж неабходна было дамагчыся, каб за бутафорскай страляніной не прападалі адценні чалавечага голасу.

Яркі тэмперамент і жыццёва праўдзівыя рысы характару перадае заслужаны артыст БССР Б. Учусаў у ролі байца Кукушкіна. Нездарма ён так палюбіўся нашаму гледачу. Кукушкін на сцэне—чалавек яснага розуму, непахісная волі і вытрымкі, верны таварышу, жартаўнік і весялун сярод сяброў, насцярожаны, вынаходлівы і мужны ў стане ворагаў.

У п'есе ёсць два прадстаўнікі камандзіраў Чырвонай Арміі старэйшага пакалення — палкоўнік Ермашоў і камісар Калеснікаў. Абодва яны з'яўляюцца арганізатарамі і натхніцелямі гераічнай абароны. Цяпер нябожчык заслужаны артыст БССР П. А. Маркін іграў палкоўніка Ермашова. Створаны ім вобраз надоўга застанецца ў нашай памяці.

Сённяшні выканаўца ролі Ермашова заслужаны артыст БССР Ю. Уласаў, узбагаціў вобраз, зрабіў яго яшчэ больш значным і важнім.

Шмат працы і творчай фантазіі ўклаў заслужаны артыст рэспублікі М. Абрамаў у стварэнне вобраза камісара Калеснікава. Не адзін дзень блукаў анцёр па руінах крэпасці, спрабуючы паўней уявіць сапраўдную карціну бяспрыкладнага змагання.

— Мы ведаем, Леанід Паўлавіч, што ваш спектакль глядзелі ў Маскве і ў Вінніцы, у Мінску і ў Днепрапятроўску. Як успрымаюцца падзеі, адлюстраваныя на сцэне, далёка ад Брэста?

— Прымаюць наш спектакль усюды выключна добра. Хіба забудзе выканаўца ролі Аляксея Наганава, ды і не адзін ён, як аднойчы на сцэну ўзнялася дванаццацігадовая дачка героя і пранікнёна сказала: «Дзякуй табе, тата, за твой подзвіг. Ты аддаў сваё жыццё за тое, каб мы маглі спакойна жыць і працаваць!»... Не толькі артыста А. Вятошкіна,— увесь калектыў усхвалявала такое прызнанне перакананаўчасці спектакля. Цяпер, дарэчы, А. Вятошкін іграе роль начштаба Малышава.

Выступалі мы і ў Маскве, у Крамлёўскім тэатры. І да глыбіні душы крануў усіх нас такі выпадак. У фінале аднаго з паказаў праз усю залу Вялікага Крамлёўскага тэатра да сцэны падышлі дзве сівыя жанчыны і па-руску тройчы нізка пакланіліся ўдзельнікам спектакля, якія стаялі на сцэне. Усталявалася раптам такая цішыня, што, здавалася, можна было пачуць біццё сэрцаў людзей.

— А за межамі нашай краіны?

— Мы пакуль што гастраліравалі толькі ў суседзяў—у Польшчы. Ужо на першых паказах у Беластоку, а потым і ў Любліне, Радзіні, Белай Вежы і іншых гарадах Люблінскага і Беластоцкага ваяводстваў у глядзельных залах тэатраў і клубаў мы бачылі не раўнадушных гледачоў, якія прыйшлі на спектакль дзеля цікаўнасці, а людзей, для якіх лёс абаронцаў Брэсцкай крэпасці не абыякавы. Спектаклі прымаліся выключна горача: апладысменты, воклічы адабрэння, добрыя і шчырыя словы, сказаныя ў адрас тэатра і асобных творчых работнікаў, былі не толькі традыцыйнымі словамі гасцінных гаспадароў.

— Што вы можаце сказаць пра «жыццё спектакля»—як ён захоўваецца ва ўсёй сваёй непасрэднасці на працягу вось ужо амаль паўтара дзесятка гадоў?

— Кожны ведае, што значыць для мастака здзейсненая мара. «Брэсцкая крэпасць»—гэта была творчая мара калектыву. І захаванне яе трапяткой палымянасці—заўсёдны наш клопат. І галоўнага рэжысёра, выхаванца тэатра, заслужанага артыста БССР Г. Волкава, і кожнага з выканаўцаў. Новыя нашы акцёры лічаць за гонар выступаць у гэтым спектаклі нават у масавых сцэнах. Тым больш, што артысты камсамольскага тэатра—летуценнікі ў лепшым значэнні гэтага слова. Вось і цяпер калектыў набліжаецца да новай сустрэчы з драмай, умоўна кажучы, «брэсцкай тэмы». І зноў—драматург Кастусь Губарэвіч. Але падрабязна пакуль што аб новай рабоце гаварыць рана. На ўзнагароду тэатр аднажа натхнёным пошукам вялікай мастацкай праўды пра нашых сучаснікаў і суайчыннікаў.

Фатаграфія нагадала...

БАЯВЫЯ СЯБРЫ

Гэта члены партыйнай і камсамольскай ячэек Цэнтральнай партыйнай школы пры ЦК КП(б)Б. Сакавік 1923 год.

Кажуць, что ў жыцці заўсёды ёсць месца подзвігу. Гэта правільна. Але, на маю думку, не на пустым месцы ўзнікае гатоўнасць чалавека на подзвіг. Чалавек павінен быць падрыхтаваным да гэтага ўсім папярэднім жыццём.

Пра ўсё гэта я думаю, калі гляджу на фотакартку, якую сёння прапаную ўвазе чытачоў «Літаратуры і мастацтва». Адзін чалавек тут асабліва прыцягвае маю думку. Гэта зусім яшчэ маладзенькая дзяўчына, што сядзіць у першым радзе трэцяй справа. Яна ў старым, не па росту вялікім паліто, старых чаравіках... Гэта наша Верачка. Вера Харужая — будучы Герой Савецкага Саюза, адважная падпольшчыца, якая загінула ад рук гестапаўцаў у дні вайны...

Так, ёй тады было не больш дваццаці. І гледзячы на яе яшчэ па-дзіцячы пухлаваты твар, ніколі б не падумаў, што за плячыма дзяўчыны — смелыя рэйды ў тыл белапалякаў, удзел у разгроме банд Булах-Булаховіча і Савінкава...

У нас Вера была камсамольскім завадатарам — вясёлым, задорным, з невычэрпнай выдумкай... Ага, я ж забыўся сказаць, дзе гэта — «у нас». «У нас» — значыць у Цэнтральнай партыйнай школе пры ЦК КП(б)Б. І здымак гэты зроблены ў сакавіку 1923 года з нагоды першага выпуску слухачоў школы, якая рыхтавала партыйных, камсамольскіх і савецкіх работнікаў.

Прабягаю позіркам твары... Амаль усе мы тут маладыя, дваццацігадовыя... І амаль ва ўсіх у мінулым баявыя, трывожныя гады.

Вунь сядзіць першай злева Гутман (не памятаю яе імя) — паплечніца Веры Харужай, з якой разам ваявала супраць белапалякаў. У другім радзе першая злева — камуністка Дваскіна, якая прыехала ў школу з Бабруйскага павета. Яна прымала актыўны ўдзел у ліквідацыі банды капітана Караткевіча ў канцы 1921 года. Са слуцкай арганізацыі прыехалі камуністы Вальфоўскі (у першым радзе, першы справа) і Чыж (сядзіць каля яго). Абодва яны ў нядаўнім мінулым — чырвоныя партызаны, сядзелі ў белапольскай турме, адкуль уцяклі... Таварышы Кізіла (стаіць другі злева), Вашкевіч (стаіць ля яго) і Снытко (стаіць другі справа) — прыбылі з Мінскай павятовай партарганізацыі — таксама актыўныя ўдзельнікі грамадзянскай вайны. Ну, і аўтар гэтых радкоў (стаіць першы справа)... У цяжкім 1920 годзе яму, шаснаццацігадоваму пастушку-батраку ўручылі камсамольскі білет. З незвычайным гонарам апрануў ён тады ўпершыню гімнасцёрку і будзёнаўку. І, перакінуўшы праз плячо скураную партупею, адчуў сябе сапраўдным камісарам. А неўзабаве яму разам з іншымі камсамольцамі і камуністамі роднага сяла Гарбацэвічы прывялося трымаць бой з бандай капітана Караткевіча...

Вось такімі мы прыехалі на вучобу ў Мінск. Прыехалі па камандзіроўках павятова-гарадскіх камітэтаў КП(б)Б (у школу камандзіраваліся тыя члены партыі і камсамола, якія атрымалі баявое хрышчэнне ў барацьбе з ворагамі Савецкай улады, прымалі актыўны ўдзел у станаўленні роднай улады ў Беларусі).

Так, гэта былі незабыўныя гады... З якой прагай мы накідваліся на кнігі — можна сказаць першыя сапраўдныя кнігі ў нашым жыцці, — з якой увагай слухалі выкладчыкаў. Адзін з іх на здымку (ён сядзіць у цэнтры ля Веры Харужай). Гэта А. І. Лур'е, стары камуніст, чалавек вялікай эрудыцыі і высокай культуры. (Пасля Айчыннай вайны прафесар А. І. Лур'е загадваў кафедрай палітэканоміі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна).

Назаўсёды застануцца ў памяці лекцыі па гісторыі бальшавіцкай партыі, якія чыталі сакратары ЦК КП(б)Б таварышы Багуцкі і Кнорын.

Слухачы школы не толькі авалодвалі вышынямі навукі. Адначасова ўсе мы былі і байцамі атрада часцей асобага прызначэння па барацьбе з бандытызмам. І трэба сказаць, нам не раз прыходзілася паднімацца па трывозе...

Закончыўшы школу, мы разляцеліся па розных кутках рэспублікі. Быў цяжкі час, толькі-толькі скончылася грамадзянская вайна, панавала разруха... Так што кожнага з нас чакала вялікая работа.

Вера Харужая, якая мела вопыт работы прафесіянальнага рэвалюцыянера, неўзабаве ўзначаліла падпольны Цэнтральны Камітэт Камуністычнага Саюза моладзі Заходняй Беларусі. Раманчук — сакратар партячэйкі школы (ён сядзіць побач з Лур'е) быў абраны сакратаром Барысаўскага гарадскога камітэта камсамола, а я — Мазырскага.

Пра лёс астатніх таварышаў я не ведаю. Але ўпэўнены — усе яны з гонарам пранеслі праз усё жыццё адданасць роднай Камуністычнай партыі, любоў да Радзімы.

І. ГАЛАДКО,
кандыдат эканамічных навук.

ПЕРАМОЖЦЫ ПЕРАДСВЯТОЧНАГА СПАБОРНІЦТВА

Магазіны сеткі Упраўлення кніжнага гандлю Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па друку датэрмінова, 26 кастрычніка, выканалі дзесяцімесячны план продажу кніг.

Пераможцам усесаюзнага спаборніцтва ў гонар 50-годдзя Савецкай улады прызнаны Магілёўскі аблкнігагандаль, які выканаў план дзесяці месяцаў 20 кастрычніка.

Кнігарня № 5 гор. Бабруйска стала пераможцам конкурсу на лепшы магазін, аб'яўленага Дзяржаўным камітэтам Савета Міністраў БССР па друку, Беларускім рэспубліканскім камітэтам прафсаюза работнікаў культуры і Беларускім рэспубліканскім праўленнем НТТ паліграфіі і выдавецтваў. Кнігарні прысвоена ганаровае званне — «Узорная».

П. АНДРЭЕЎ.

САРДЭЧНАЕ ДЗЯКУЙ

Пісьменнік Уладзімір Дубоўка — наш зямляк. Вучні і настаўнікі нашай школы вядуць з ім перапіску. У школьнай бібліятэцы ёсць кнігі з аўтографам пісьменніка. Нядаўна ён прыслаў нам яшчэ адзін каштоўны падарунак — новую сваю кнігу «Жоўтая акацыя», а таксама кампленты часопісаў і кніг і кінаапаратуру. Нам хочацца праз газету «Літаратура і мастацтва» перадаць глыбокую падзяку Уладзіміру Мікалаевічу за гэты падарунак і напярэдадні свята пяцідзесяцігоддзя Савецкай улады пажадаць яму добрага здароўя і новых творчых поспехаў.

Н. ЖУК,
настаўніца Меньскавіцкай школы
Пастаўскага раёна.

Юбілейная афіша

1918 год, ШОСТАЕ ЛІПЕНЯ

Кастрычніцкая прэм'ера ў тэатры імя Якуба Коласа

УДЗЕНЬ прэм'еры гэтага спектакля яшчэ здалёк будынак тэатра ў Віцебску ўражваў незвычайным выглядам: над уваходам на фоне белых калон палымнеў чырвоны транспарант. На ім золатам гарэлі нязвыклыя словы:

«5-й Всероссийский с'езд Советов рабочих, крестьянских, крас.-арм. и казачьих депутатов».

Ужо тут, перад будынкам, глядач рабіўся нібы ўдзельнікам падзей шостага ліпеня 1918 года, калі ў Вялікім тэатры ў Маскве праходзіў памятны з'езд, на якім У. І. Ленін і бальшавікі, карыстаючыся перадышкай пасля Брэсцкага міру, выкрываючы дэмагогію левасэраўскіх крыкуноў, імкнуліся замацаваць мірныя пазіцыі краіны і прыступіць да неадкладнай пабудовы сацыялізма.

Гэтаму пачуццю прыналежнасці да падзей і асабістай адказнасці за ўсё, што адбывалася, спрыяла і не надта багатая, але прадуманая і ва ўсіх дэталях звераная «з арыгіналам» наглядная агітацыя — плакаты, якія нагадвалі славутыя «вокны сатыры РОСТА», з вершамі Дзям'яна Беднага на бурай абгортачнай паперы.

Прыём не новы, але, як паказаў вопыт Тэатра на Таганцы, даволі дзейсны і ўражлівы. Ды і наогул, што, урэшце, прынцыпова новага бачым мы сёння ў тэатры? Сцэну без заслоны? Дык гэта ўжо было. Выхады акцёраў у глядзельную залу па «дарозе кветак»? Дык гэта, бадай, адзін з самых старажытных і, дарэчы, не самы лепшы сродак яднання акцёра з гледачом... А вось стварэнне пэўнай атмасферы задоўга да таго, як пачнецца дзеянне, — гэта, мабыць, неабходна сённяшняму тэатру, калі ён хоча сабраць у зале не абыякавых людзей, што выпадкова забеглі «на агеньчык», а аднадумцаў.

Гэтай мэце ў тэатры імя Я. Коласа служыць літаральна ўсё — ад афішы да праграмкі, на афармленне якіх коласаўцы не пашкадавалі ні паперы, ні фарбаў, ні фантазіі. Такая «падрыхтоўка» гледача, мне здаецца, заслугоўвае ўвагі.

У самім спектаклі, зрэшты, «навацыі» не так ужо і многа. Нават заслона ёсць. І кожны эпізод шатроўскай «спробы дакументальнай драмы» (дарэчы, выдатна перакладзенай на беларускую мову П. Макалём) абмежаваны пэўным адрэзкам часу. Паўзы паміж эпізодамі дапамагаюць гледачу сканцэнтравацца, нешта — галоўнае — вылучыць, «пераварыць» і запомніць і, што асабліва важна, унутрана падрыхтавацца да ўспрыняцця далейшага.

Праўда, гэтаму не заўсёды адпавядае музыка, што запаўняе прамежкі паміж кавалкамі дзеяння. Яна створана да спектакля па гэтай жа п'есе М. Шатрова ў іншым тэатры і не ўсюды арганічная, выкарыстоўваецца хутчэй для прыглушэння шуму ў час перамены дэкарацый, часта абрываецца, як кажуць, «на паўслове», бо — «пайшла заслона».

Заслона — нязвыклая. Яна нібы склеена з тагачасных газет, адозваў. На ёй мы бачым і вокладкі брашур і кніг У. І. Леніна, што выйшлі з друку ў той час: «Барацьба за хлеб», «Як ашукалі народ сацыялісты-рэвалюцыянеры і што даў народу новы ўрад бальшавікоў» і інш (мастак Я. Нікалаеў).

«Дакументальнасць», дэкляраваную заслонай, тэатр імкнецца захаваць ва ўсім. Дзеля гэтага рэжысёр С. Казіміроўскі часам свядома ідзе нават на парушэнне так званага «аўтарскага права». Зрэшты, пачынаецца спектакль не як звычайна ў іншых тэатрах з прывычнай мітусні паміж пасяджэннямі, з сутычкам і зацятых спрэчак прадстаўнікоў дзвюх партый, што занялі тут, на з'ездзе, непрымірыма процілеглыя пазіцыі ў вырашэнні пытання вайны і міру. Гэта ўсё — наперадзе. Усё яшчэ будзе. А цяпер з-за правай кулісы выходзіць «чалавек з ружжом» — тыповая фігура для таго часу — і па складах, пакутліва пранікаючы ў сэнс напісанага, чытае адозву тых векапомных дзён — тэкст закліку, з якім звярталіся бальшавікі да людзей у шэрых шынялях. Чытае сабе, не гледачу. Але гледачы ўважліва ўслухоўваюцца. Не адрываючы вачэй ад лістка, салдат павольна сыходзіць у залу, каб заняць сваё месца недзе ў дальніх радах.

Гэты эпізод уведзены рэжысёрам зноў жа для стварэння атмасферы таго часу. Але, магчыма, і не толькі з гэтай мэтай. Справа ў тым, што ў п'есе, апроч вартавога Спірыдонавай і безаблічнага — мяркуючы па тэксту ролі — рабочага, старшыні сходу на заводзе, ды «голасу з натоўпу», наогул няма людзей з народа, якія б атрымалі ў п'есе слова. Гэты адзіны, «збіральны» вобраз безыменнага «чалавека з ружжом» (потым вартавога Спірыдонавай), якога з вялікай сілай праўды, пранікнёна, амаль «з нічога» лепіць артыст Т. Кокштыс, хоць трохі запаўняе адчувальны прабел п'есы.

Усё гэта, мабыць, крыху запавольвае дзеянне, што — па п'есе — укладваецца ў адны суткі. Шчыра кажучы, спектакль віцяблян пакуль не перадае той імклівасці падзей, няспыннага бегу часу, які ў пастаноўках іншых тэатраў удала выяўляецца то пры дапамозе гадзінніка, што адлічвае гадзіны і мінуты гісторыі, то тэлеграфнай стужкі (як у рускім тэатры імя М. Горкага), на якой з дакладнасцю да мінуты ўказаны час, калі адбывалася тая ці іншая падзея.

Але затое нават недасведчанаму гледачу ўжо ў пачатку спектакля робіцца ясна, за што, за каго і дзеля каго пойдзе зацятая барацьба паміж бальшавікамі і левымі эсэрамі на з'ездзе. А барацьба гэтая — нялёгкая. Прычым ініцыятыва ўвесь час у левых эсэраў. Гэта яны нападаюць, абвінавачваюць, нават зневажаюць У. І. Леніну і бальшавікам даводзіцца ўвесь час абараняць заваяваную Савецкую ўладу.

Драматургічна не вельмі выйгрышная сітуацыя. Але так было ў той дзень, шостага ліпеня. І драматург, а за ім і тэатр нідзе, ні на момант не адыходзяць ад праўды гісторыі, не спрабуюць ідэалізаваць становішча, «аслабіць» ворага, зрабіць яго хоць вонкава непаўнацэнным. А спробы такія рабілі ў некаторых тэатрах, нават і ў нас, у Рускім драматычным імя М. Горкага, дзе на першых спектаклях вельмі баяліся сілы акцёрскай і налавечай абаяльнасці выканаўцы ролі Марыі Спірыдонавай — А. Клімавай, схіляючы актрысу да лабавога «выкрыцця» яе гераіні. Аднак цяпер А. Клімава знайшла тую патрэбную меру шчырасці, унутранай перакананасці, што надалі вобразу Спірыдонавай жыццёвую верагоднасць.

І яшчэ адна істотная заўвага. Часам здаецца, нібы дзеючыя асобы наперад ведаюць, што ўсё ўрэшце скончыцца добра, настолькі бязвоблачна ў іх на душы, такая бязмежная самазаспакоенасць і ўпэўненасць пануе ў асобных сцэнах: гэта адчуваецца нават у Ф. Шмакава, які выступае ў ролі У. І. Леніна. Акцёру часам нібыта нестае ўсведамлення ўсёй грознасці, небяспечнасці моманту. А У. І. Ленін нездарма ж гаворыць: «Хутка дванаццаць, зроблена пакуль што вельмі мала, мы ўвесь час упускаем ініцыятыву. Я хачу, каб вы зразумелі і перадалі ўсім таварышам: калі мы не зробім адчайных намаганняў для ператварэння кісялю ў нешта цвёрдае, — мы зляцім. Становішча вельмі дрэннае».

Гэта ўжо другая сустрэча акцёра з вобразам У. І. Леніна. Першая, у спектаклі «Вечная крыніца», была як бы падрыхтоўкай да сённяшняй — у «Шостым ліпеня». Тут Ленін — у цэнтры падзей, ён амаль увесь час на сцэне і паўстае перад намі не толькі як самы чалавечны чалавек, які «да таварыша мілеў людскою ласкай, ...да ворага жалеза быў цвярдзей», але і як геніяльны правадыр, як дальнабачны палітык, палымяны агітатар, кіраўнік партыі і ўрада. Задача незвычайна цяжкая і адказная. І трэба сказаць, што Ф. Шмакаву ўдалося перадаць многія істотныя рысы дарагога ўсім нам чалавека. Вельмі добра, што, шукаючы падабенства, акцёр аддае перавагу ўнутранаму, не хаваючыся за стаўшыя традыцыйна-штампаванымі ад частага паўтарэння любімыя «ленінскія» позы, звычкі, не карыстаючыся зафіксіраванымі кінематографам выйгрышнымі ракурсамі. Адчуваецца, што рэжысёр і акцёр, працуючы над вобразам, не ішлі пратаптанымі сцежкамі, не хапаліся за знойдзенае іншымі, не стараліся скапіраваць вонкавыя рысы, а імкнуліся паглыбіцца ў сутнасць ленінскага характару, зрабіць «сваёй» яго думку, сам спосаб мыслення, пранікнуцца яго светапоглядам, «выхоўваючы» ў сабе, наколькі гэта магчыма, ленінскія якасці.

Праўда, не заўсёды яшчэ мы адчуваем, як «нараджаецца» думка, як «афармляецца» яна ў свядомасці перад тым, як будзе выказана. Не заўсёды яшчэ Ф. Шмакаў арганічны ў ролі, яму часам нестае не толькі глыбіні мыслення, але і ленінскай непасрэднасці ў выяўленні пачуццяў, імправізацыйнасці, той зайздроснай лёгкасці і дакладнасці, з якой вырашаюцца найскладанейшыя задачы, адным словам, рысаў геніяльнай натуры.

Але дзіўная рэч! Мне здалося, што словы Маякоўскага «Я сябе пад Леніным чышчу, каб плысці ў рэвалюцыю далей», сталі няпісаным законам у тэатры ў час работы над спектаклем. І не толькі для Ф. Шмакава, але і для іншых. Усё дробнае, неістотнае адышло само сабой убок, саступіўшы месца творчаму гарэнню і высокай прынцыповасці ў вялікім і малым. Нават па тым, як ішла генеральная рэпетыцыя, можна было меркаваць, што для ўсяго калектыву коласаўцаў пастаноўка п'есы «Шостае ліпеня» — надзвычайная падзея. Ва ўсім, што рабілі людзі — ад выканаўцаў галоўных роляў да рабочых сцэны, — было гэтулькі ўзаемнай павагі, добразычлівасці, пачуцця ўласнай годнасці, гонару і адказнасці за даручаную справу, што міжволі падумалася: рэпертуар — сродак выхавання не толькі гледача, а ў не меншай ступені — і акцёра. І вельмі радасна, што моладзь тэатра злілася з кагортай праслаўленых майстроў у адзіным імкненні — стварыць сапраўды ансамблевы спектакль.

У п'есе апроч некалькіх дзеючых асоб, надзеленых пэўнымі характарамі, большасць усё ж — звычайныя «вестуны», канстататары падзей, па сутнасці, службовыя ролі. Тым не менш кожны выканаўца імкнецца індывідуалізаваць свайго героя, знайсці тое галоўнае, чым жыве ён у кожны момант свайго знаходжання на сцэне. Магчыма, таму запамінаюцца нават такія амаль «бясслоўныя» вобразы, як Праш'ян (артыст Б. Сяўко), Хрусталёў (нядаўні ўдзельнік самадзейнасці, цяпер — артыст дапаможнага складу Л. Трушко) і іншыя.

У імкненні насяліць спектакль жывымі людзьмі калектыў знайшоў істотную падтрымку ў рэжысёра. Гэта ён, рэжысёр, узяў на сябе «персанальную адказнасць» за тое, што сярод дзеючых асоб не стала Даніпэўскага — малавыразнай фігуры ў п'есе. З ім У. І. Ленін гутарыць па тэлефоне — і ўсё зразумела! Гэта ён «сабраў» рэплікі розных дзеючых асоб і аддаў іх аднаму — вартавому (арт. Кокштысу), «чалавеку з ружжом». Гэтак жа ажывіў ён і вобраз Хрусталёва, які выступае перад рабочымі, як бальшавіцкі агітатар, хоць не ўмее «прыгожа гаварыць». Атрымаліся праўдзівыя, жыццёвыя вобразы. Імкненне тыпізаваць, абагуліць з'яву, вобраз і ў той жа час індывідуалізаваць яго — адметная рыса рэжысуры гэтага спектакля.

Спектакль дакладны па думцы, перакананўчы ў сваёй жыццёвай праўдзівасці. «Дакументальнасць» не засушыла яго, наадварот, надала большую непаўторнасць характарам, у якіх дакладна вызначыліся адметныя рысы часу.

Асабліва яскрава гэтыя рысы часу выявіліся ў вобразах паплечнікаў У. І. Леніна Свярдлова (арт. В. Рубан) і Дзяржынскага (арт. У. Куляшоў). Шмат цёплых слоў было сказана ў свой час у адрас выканаўцы ролі Свярдлова ў Рускім тэатры імя М. Горкага вопытнага акцёра П. Будзяка. Але мне здаецца, што малады беларускі акцёр В. Рубан не горш за масцітага калегу справіўся са сваёй задачай. Ён здолеў пранікнуць у душэўныя глыбіні свайго героя і выявіць яго высокі інтэлект, выдатныя арганізатарскія здольнасці, вытрымку, волю і рэдкаснае самавалоданне, якое жывіцца тонкім пачуццём гумару і невычарпальным запасам аптымізму.

Не менш уражвае і вобраз «рыцара рэвалюцыі» Фелікса Эдмундавіча Дзяржынскага, паказанага, бадай, у самы цяжкі для яго момант — калі нават у самым сэрцы ЧК сталася чорная гадзюка здрады. «Жалезны Фелікс» хутчэй у сваёй бязмежнай патрабавальнасці да самога сябе; у дачыненні ж да сваіх паплечнікаў і падначаленых, ён — надзвычай чалавечны, даверлівы і шчыры. І вось цяпер ён (можа, як ніхто) пакутуе ад усведамлення сваёй «віны» перад партыяй і народам за тое, што не змог папярэдзіць лева-эсэраўскі мяцеж, што даверыўся свайму намесніку Александровічу, які аказаўся здраднікам. Немагчыма забыць кароткую, але такую эмацыянальна насычаную сцэну, калі, вызваліўшыся з-пад арышту, у размове са Свярдловым ён спачатку здзіўляецца, а пасля шчыра шкадуе, што левыя эсэры не расстралялі яго: «Ты ўяўляеш, як бы лаяў сябе выкрылі ў вачах народа?..» У гэтай кароткай сцэне верныя сябры і паплечнікі У. І. Леніна паўстаюць перад намі ва ўсім багацці душэўнага хараства.

Вельмі мала матэрыялу для стварэння паўнакроўных вобразаў дае п'еса, выводзячы на сцэну Чычэрына, Бонч-Бруевіча, Падвойскага, Лацыса. І нягледзячы на вялікія намаганні акцёраў, яны так і засталіся службовымі персанажамі.

Больш пашанцавала «левым эсэрам». Амаль кожны з іх надзелены не толькі біяграфіяй, але і пэўнымі рысамі характару. Іх не зблытаеш — Камкова (І. Матусевіч), Сабліна (Г. Дубаў), Праш'яна (Б. Сяўко), Галубоўскага (С. Казлоў), Калегаева (Ц. Сяргейчык), Александровіча (А. Трус), Папова (В. Анісенка). Хочацца толькі папракнуць выканаўцу апошняй ролі за тое, што, стараючы яркі, каларытны і вонкавы маляўнічы вобраз, акцёр не заўсёды дакладны і эканомны ў адборы дэталяў і крыху выбіваецца з ансамбля. Да таго ж В. Анісенка карыстаецца тут набытым у іншых спектаклях «багажом» — міжволі ў памяці ўсплывае яго Улдыс з «Ветрык, вей!» А прырода ж тэмпераменту гэтых двух герояў, не гаворачы ўжо аб вмесце вобразаў, зусім розная. Мабыць, варта было пашукаць больш адпаведныя фарбы.

І яшчэ адно назіранне, якое нібыта і не «кладзецца» ў рамкі рэцэнзіі, але паказвае, як ствараўся гэты не зусім звычайны спектакль. Мае заўвагі, меркаванні, сумненні, якімі я шчыра дзялілася з акцёрамі, прымалі яны не проста, як гэта часта бывае ў тэатры, — ветліва-абыякава, добразычліва ці хваравіта. Я сустрэлася з падрыхтаванымі, узброенымі «да зубоў» апанентамі, якім прадмет размовы быў вядомы да драбніц. І сваю глыбокую перакананасць у тым ці іншым яны імкнуліся пацвердзіць не інтуітыўнымі адчуваннямі, а спасылкамі на сапраўдныя факты, на дакументы: стэнаграмы з'езду, фатаграфіі, кінакадры, газеты, адозвы, якія яны не толькі бачылі недзе «ў музеі» ці пра якія чулі ад рэжысёра ў час так званага «застольнага перыяду» работы над п'есай, а мелі пад рукой, па іх выяўляючы сваё «жыццё ў вобразе».

Калі я заўважыла Г. Маркінай, што яе вонкавае аблічча ў ролі Марыі Спірыдонавай нечым нагадвае ў гэтай ролі Г. Рыжкову з тэатра імя Ленінскага камсамола, яна не пакрыўдзілася, а сказала, што ніколі не бачыла ніводнага спектакля па п'есе М. Шатрова, каб не быць у залежнасці ад чужой трактоўкі ролі, і з запалам і болем, як сваю ўласную, расказала мне з усімі падрабязнасцямі біяграфію сваёй гераіні, «уяла ў курс» яе ўзаемаадносін з людзьмі, паспрабавала нават вызначыць гістарычныя прычыны яе трагічнай памылкі. І ўрэшце прынесла партрэт М. Спірыдонавай — фота 1927 года, якое ўразіла мяне не столькі вонкавым, колькі ўнутраным падабенствам з тым вобразам, у якім жыла актрыса. Фанатызмам, безагляднаю верай у «ісціннасць» сваіх перакананняў і прадбачанняў гарэлі вочы Г. Маркінай — Спірыдонавай, непахісная воля чыталася ў яе моцна сцятых вуснах.

Адважны, перакананы і бязмежна шчыры ў сваіх памылкавых поглядах і таму асабліва небяспечны вораг, які менавіта гэтай шчырасцю мог захапляць іншых і весці за сабою маласвядомых — такой малявала Маркіна сваю Спірыдонаву. Я сказала, што ў сцэне з'езду яна не выглядае істэрычнай — усё, што яна гаворыць, вельмі прадумана і ўзважана, а такія натуры часта бываюць пад уплывам моманту. Назаўтра Маркіна прыйшла да мяне са свежым нумарам «Літаратурнай газеты», у якой было надрукавана апавяданне А. Алдан-Сямёнава «Ноч перад пакараннем», і паказала падкрэсленую фразу з дзённіка Якава Шэйнкмана — члена асобай камісіі, якому давялося дапытваць Марыю Спірыдонаву: «І гэта — правадыр левых эсэраў? Яна карыстаецца зусім незаслужанай папулярнасцю. Істэрычка, хоць і вельмі шчыры чалавек. Прыгожымі фразамі ўвесь час разбурае лагічнасць сваёй думкі».

— Вы мелі рацыю. Яна сапраўды, мабыць, не ведае, што скажа далей. Трэба падумаць, як згодна з гэтым перабудаваць унутраную лінію яе паводзін у час выступлення на з'ездзе, — сказала Галіна Маркіна.

І я здзівілася і шчыра ўзрадавалася той настойлівасці, нават апантанасці, з якой актрыса няспынна шукала ключ да вобраза сваёй гераіні. Захацелася пажадаць ёй удачы. І вялікай удачы — усяму калектыву, бо працаваць яшчэ ёсць над чым, шмат што ў спектаклі трэба ўдасканаліць і ўдакладніць. Не знойдзены, напрыклад, пакуль што фінал спектакля. А ў ім жа гучыць вельмі надзённая сёння ленінская думка, якая выяўляе ідэю спектакля: «Адзін дзень міру дасць будаўніцтву сацыялізма намнога больш, чым дзесяць дзён няхай сабе нават самай пераможнай вайны».

Тамара БУШКО.

З ПАДАРОЖЖА Ў БЛІЗКАЕ ДАЛЁКАЕ

Уладзімір УЛАДАМІРСКІ,
народны артыст СССР

У людзей майго пакалення стаюць ужо ўнукі, маладыя людзі, якім дзіўна бывае, калі яны даведваюцца, што чагосьці некалі, і не так ужо даўно, **не было**. Напрыклад, у беларусаў не было сталага тэатра, не было універсітэта, не было... Нашы нашчадкі шчаслівыя — ім ёсць дзе праявіць свой талент. Майму ж пакаленню выпала шмат чаго рабіць упершыню.

Для мяне заўсёды ёсць штосьці сімвалічнае ў тым, што цяперашні Акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы ўпершыню адкрыў свае дзверы — гэта было 14 верасня 1920 года, — калі ў Мінску яшчэ не астыў попел спаленых акупантамі дамоў, а ў навакольных лясах чырвонаармейцы вялі бай з рэшткамі белабандытаў. Баявое нараджэнне!

Прэм'еры тады адбываліся даволі часта. Побач з вопытнымі артыстамі на сцэне выступалі зусім яшчэ падлеткі. Кожную арыгінальную п'есу даводзілася «чытаць» у першы раз: ніякіх традыцый іх выканання яшчэ не склалася. Але чароўная сіла натхнення і працавітасці дапамагала маладому тэатру адразу, я сказаў бы па-вайсковаму, трывала заваёўваць пазіцыі сапраўднага мастацтва. Гэта здзіўляла ўсіх. Радасна здзіўляліся заснавальнікі драматычнай трупы — Генрых Грыгоніс, Фларыян Ждановіч, Кацярына Міропава, Лідзія Ржэцкая, Барыс Платонаў: яны адчувалі, што ў нас складваўся ансамбль акцёраў. Чыгуначны тэлеграфіст Уладзімір Крыловіч з першых роляў захапіўся сам і захапіў усіх нас незвычайным тэмпераментам і нястомнай прагай іграць. Днём і ўначы рэпеціраваў з намі новыя ролі і спектаклі рэжысёр і драматург Еўсцігней Афінагенавіч Міровіч. У тым, як пацiскалі нам далоні Цішка Гартны і Змітрок Бядуля, з якой светлай усмешкай заходзілі пасля спектакля за кулісы Янка Купала і Якуб Колас, мы таксама бачылі, што наша ігра пераконвае. І жылося і іграласся нам «у ахвотку».

У рэспубліцы нарадзіўся сталы тэатр.

Варта прыгадаць, скажам, што за якіх дзесяць гадоў да прэм'ер Першага БДТ Якуб Колас у «Нашай ніве» прызнаваўся: «На тэатральных падмостках мне давялося ўгледзець беларуса першы раз», — і шчыра здзіўляўся ўменню артыстаў — студэнтаў-аматараў з Вільні — ствараць праўдзівыя і яркія акцёрскія вобразы. І ў яго з'явілася надзея: можа быць, калі-небудзь...

А ў 1923 годзе І БДТ паказвае свае спектаклі «На купалле» і «Машэка» ў сталіцы Радзімы, і маскоўскія гледачы апладзіруюць ім. Са сцэны Крамлёўскага тэатра раздалося: «Гэй, паслухайце быліну, як даўней дзяды жылі! Беларус схаваў дагэтуль спевы сівай старыны...» У промнях рампы — Машэка, якога так маштабна і сардэчна іграў У. Крыловіч. Паслухалі нашу быліну і замежныя карэспандэнты, і вось што паведаміў сваім чытачам «Ілюстраваны тэатральны часопіс», які выдаваўся ў 1923 годзе ў Нью-Йорку: «...свет ведае цяпер пра існаванне культуры такіх народаў, аб якіх мала хто і ведаў. Так і беларускі тэатр... выклікаў да сябе вялікую цікавасць».

За якія тры гады — шлях ад першай прафесіянальнай рэпетыцыі да выступленняў у Маскве і міжнароднага прызнання!

Па праўдзе, ні адзін дзень у нас не быў змарнаваны, мы тады не ведалі стомы і вучыліся ўсюды і ў кожнага. Маладыя — у старэйшых таварышаў; на уроках фехтавання, «па голасу»; чыталі пра тэатр усё, што было ў бібліятэках Мінска; слухалі і глядзелі ўсіх гастралёраў. На кірмашах і ў касцёлах, на вакзале і ў сяброўскай гутарцы мы ўглядаліся ў «тыпы» і ў «твары», прыслухоўваліся да гаворкі дзядзькі са Слуцка і чыгуначніка з Серабранкі, рамізніка з «Залатой горкі» і харыста царкоўнай капэлы. Добра зразумелі мы любімы афарызм Е. Міровіча: «Артыст вучыцца вокам ды вухам...»

І яшчэ сказаў ён аднойчы цудоўныя словы — «эмацыянальная памяць». З яе — з сэрца свайго — вуцыў ён нас здабываць самыя запаветныя інтанацыі голасу, самыя дакладныя жэсты, самую выразную міміку. З цягам часу мы ўсё часцей пераконваліся: мастак — гэта «сховішча» дэталей, якія носіць на сваіх хвалях бурлівае жыццё. Вядома, яны не раскладзены «ў памяці» па пейкіх паліцах так, што застаецца толькі працягнуць руку — і вось табе інтанацыйная афарбоўка гамлетаўскага «Быць або не быць?..» Агульная ідэя вобраза ці, дакладней кажучы па-акцёрску, — звышзадача ў жыцці твайго сённяшняга героя — падказвае і вызначае, што іменна з перажытага табою дарэчы ў той або іншай ролі.

Зараз мне цяжка прыгадаць дакладна, што з бачанага ў іншых «адбылася» на знешнім выглядзе і на тэмпераменце, скажам, майго Сін Бін-у з іванаўскага «Браняпоезда 14-69» і Мухіна з «Моста» Я. Рамановіча, бо першы з іх — кітаец, адважны сібірскі партызан, а другі — бюракрат і прыхільнік «зялёнага змія». Адкуль з'явілася на адной з рэпетыцый інтанацыя абуранага сатрапа ў майго Івана Каламійцава ў горкаўскіх «Апошніх», калі ён патрабуе ўвагі да сябе, хоць яго і скінулі «з паліцмайстра»?

Аб гэтым у мяне часам пытаюцца, і я спрабую асэнсаваць свой уласны вопыт.

Мне дарагія адценні лёгкага смутку ў майго Данілы Дрыля ў «Партызанах» К. Крапівы, той заліхвацкі танцор, які жыве ў ім. Адкуль гэтыя рысы?

Чаму ў драме «Фронт» А. Карнейчука мой генерал Горлаў з асалодай слухаў падхаліма Хрыпуна, калі той казаў: «Сувораўская школа ў вас, Іван Іванавіч!» — і раптам камяней так, што жывым у ім заставалася адно толькі сэрца, калі брат Мірон папярэджваў яго: «Ты не ўмееш і не можаш камандаваць фронтам... Папрасі сам, каб цябе аслабанілі...»?

Зразумела, паводзіны падказваюцца тэкстам, рэмаркамі, што напісаны драматургам, рэжысёрскай трактоўкай. Але каб не было чырвонаармейскага мітынгу на станцыі Жлобін, дзе я ўглядаўся ў маладых камандзіраў і сівых начальнікаў; каб не тая сустрэча з байцамі 38-га кавалерыйскага палка, калі мой маналог на сцэне, абсталяванай у вялікім хлеве, перарвала страляніна на ўскрайку сяла і мне было загадана «ляцець алюрам» у кулямётны эскадрон «другім нумарам» і сваё выступленне я закончыў пасля начнога бою, дачытаўшы вершы Дзям'яна Беднага, не было б і сцэнічных знаходак. Звяргаюся да больш даўніх гадоў: мне, падлетку, давялося бачыць на свае вочы, як у Коўне на высокія прыступкі тагачаснага экіпажа «ўзлятаў» тамашні паліцмайстар, як ён аддаваў загад «наперад» фурману амаль што непрыкметным рухам пальцаў у белых пальчатках. Мабыць, тое-сёе ў майго Каламійцава з ковенскіх дзіцячых уражанняў.

Сяргей Брызгалін... Шкада, што «Кар'ера таварыша Брызгаліна», гэтая сатырычная камедыя Е. Міровіча, у нашы часы не знаходзіць месца ў рэпертуары, бо, на мой погляд, яна вельмі блізкая па сваёй скіраванасці да «Клопа» і «Лазні» Маякоўскага. Памятаю, колькі смеху было ў зале, калі Брызгалін нахабна ганарыўся сваім уменнем прыстасоўвацца на любой важнай пасадзе, на любым месцы: «Перавядуць у Крым да татараў — і іхняе «шалды-балды» вывучым!..» Спачатку з гэтым прайдзісветам па-акцёрску ў мяне не ладзілася. Успамінаў я падобных да яго людзей, што сустракаліся мне ў тым жа Бабруйску ці ў Мінску, спрабаваў «узяць» вонкавай напышлівасцю і імклівымі пераменамі рытму і ўсё роўна нечага істотнага не хапала. Глядзеў на мае пакуты Міровіч і кажа аднойчы:

— Пашукай ты ягоную паходку. Ён жа былы жандар і, пэўна, кавалерыст, любіць паказаць сябе, пафанабэрыцца.

ДА 85-годдзя З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ЯКУБА КОЛАСА

СЯРОД ЛЮДЗЕЙ СВАІХ

Танім ён нам і ўяўляецца. Народны пісьменнік, народны дэпутат, чалавек, вуснамі якога гаварыў беларускі народ пра сваё жыццё. Ён — акружаны людзьмі — свой спрод сваіх. Як сказаў паэт пра яго. «Добры друг усяго, што расце і жыве — зямляў, сонцаў і сэрцаў праетору вялікага, сціплы той чалавек, што наўкруг дзядзькам клікалі, бацькам клікалі». Уважлівы да людскога клопату, чуйны на жывое слова і дасціпную ўсмешку, ўдумліва ўбірае ён у сваё сэрца людскі клопат і людскую радасць..

Гэты здымак зроблены ў вёсцы Балачанка Пухавіцкага раёна. Сюды не аднойчы прыязджаў Якуб Колас адпачываць і працаваць. Тут ён любаваўся на «празрыстасць рэк, дубоў жывы шалаш, дарог нязлічаных красёнцы» і чэрпаў натхненне ад хараства роднай зямлі. І часта сустракаўся тут з людзьмі. Старэйшы, мудры, абвеяны цеплынёй людской пашаны, не цураўся ёнбудзённай простай гамонні з балачанцамі — наадварот, ён хацеў ведаць да драбніц іхняе жыццё, жыццё гэтых жанчын-працаўніц, якім так проста і весела побач з ім — таксама працаўніком, сейбітам мудрых слоў, знаўцам і летапісцам народнага жыцця. У такіх сустрэчах з роднай зямлёй і з роднымі людзьмі пачыналіся і выспявалі яго мастацкія задумы.

Фота Ул. КІТАСА.

ДУШЭЎНЫ ЛЕТАПІС ПАЭТА

Да 85-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа мы атрымалі цудоўны падарунак — зборнік лірыкі народнага паэта «З майго летапісу», выпушчаны выдавецтвам «Беларусь». Зборнік склаў Максім Лужанін, аформіў—мастак В. Шаранговіч, і дзякуючы ім, трымаем у руках прыгожую кніжку, у якой прадстаўлена коласаўская лірыка, ад рэвалюцыйных падзей 1905 года і канчаючы 1956 годам.

Нашым пачуццям і думкам, якія ўзнікаюць пры чытанні кнігі «З майго летапісу», вельмі сугучны змястоўны і прачулы ўступны артыкул Міхася Стральцова. У прадмове, напісанай жыва і ўсхвалявана, паказана мастацкая непаўторнасць і хараство коласаўскай паэзіі, яе ідэйная значнасць, яе неўміручая веліч, яе месца і роля ў станаўленні і развіцці беларускай культуры, яе значэнне для сучаснікаў і нашчадкаў.

«З майго летапісу» ўпрыгожыць кніжную паліцу юбілейнага года.

П. МАШКОВІЧ.

ТОЕ, ШТО НЕ ЗАБЫВАЕЦЦА

Антон БЯЛЕВІЧ.

Я ШЧЭ тады, калі не хадзіў я ў пачатковую школу, ведаў, што ёсць, жыве на свеце вялікі паэт Якуб Колас. Пра яго расказваў мне настаўнік, мой дзядзька Хведар Курэйчык, які страчаўся з паэтам у Мінску. Чытаў ён мне вершы і паэмы Коласа, і паэт мне чамусьці заўсёды ўяўляўся нейкім мудрым чараўніком, які сваім зоркім вокам бачыць, як бацька мой, сеўшы на ўслончык, падплятае лапаць, як арэ, барануе свой пясчаны загончык за Дуброўкаю; як маці бразгае патэльняй, пячэ раніцою ў нядзельку бліны на сняданак; як ідзе з пашы «бык Мікіта, хвастом махаючы сярдзіта». «Як жа гэта? — думаў я тады. — Якуб Колас ніколі ні разу не быў тут, а так добра прыкмеціў жыццё, побыт нашай Дуброўкі?..»

А пасля я ўжо сам чытаў Якуба Коласа, і зноў здзіўляўся, радаваўся.

Мой родны кут! Як ты мне мілы!
Забыць цябе не маю сілы!..

Дык гэта ж зноў пра наш маляўнічы, зялёны кут! Вунь, на ўзлеску той вялікі дуб, пра які пісаў паэт... А вунь і тая светлая рака, тая зіхацюткая вясёлка над поплавам, пра якія так хораша пісаў Якуб Колас... І я нібыта наяве бачыў самога народнага песняра...

І, праўду кажучы, быў трохі расчараваны, калі ўпершыню пабачыў яго на свае вочы.

А было гэта так: з Пухавіцкай раённай газеты, яшчэ ў пачатку трыццатых гадоў, паехаў я ў калгасы Талькаўскага сельсавета. Быў спякотны летні дзень. Пайшоў да Свіслачы — паплёхацца. Бачу — сядзіць на беразе пад ракітавым кустом нейкі дзядзька, вудзіць рыбу. Прыйшоў на бераг і мой знаёмы аграном з калгаса. Мы з аграномам пачынаем раіцца, дзе лепш зайсці ў раку, а дзядзька рукою махае нам: далей адыдзіцеся, не палохайце рыбу... От яшчэ! Плюхнуўся я ў ваду. Дзядзька падняўся, зматаў вуды.

— Ай, нядобра, — нахмурыўся аграном.

— А што?

— А тое: Коласаву рыбу ты папалохаў, разагнаў.

— От яшчэ! Не выдумляй.

— Я праўду кажу. Якуб Колас гэтую мясціну аблюбаваў...

— Чакай! — перапыняю таварыша. — Дык гэта Якуб Колас быў?!

— Ён.

Веру і не веру! Які ж гэта Колас? Я ж думаў пра яго, як пра дзівоснага чараўніка, як пра казачнага асілка, а то — звычайны чалавек, у нейкім аблавухім капелюшы, басаногі.

А таварыш хітравата ўсміхаецца, кажа:

— Рыбак. У камашах, у макінтошах рыбакі не ходзяць на раку...

І, падумаўшы, дадаў:

— Якуб Колас — чалавек прыроды. З ракою, з рыбаю, з грыбамі дружыць. Між птушыных галасоў, між шолаху травы, каласоў, лесу жыве Якуб Колас...

І тады я падумаў: «Усё гэта жыве ў сэрцы паэта, усё гэта спявае ў ягонай душы...» І чамусьці мне прыгадаўся партрэт-малюнак, на якім Леў Талстой ідзе за сахою; прыгадалася карціна, дзе Міхаіл Іванавіч Калінін косіць траву...

Трохі пазней, ужо ў Мінску, я прыйшоў у Акадэмію навук да Коласа, каб узяць у яго верш, які ён напісаў для «Чырвонай змены».

— Сядай, браце, — паказаў ён мне на крэсла і пачаў чытаць верш.

— Ну, як? Можа, не тое напісалася, што вам трэба?

— Тое! Якраз тое! — ускочыў я. — На першай паласе дадзім!

— Так ужо і на першай? А хіба ж ты там галоўны, браце? — запытаў і добра ўсміхнуўся сардэчны чалавек.

Вядома, ніякім галоўным я не быў. Няёмка мне зрабілася: выскачыў, пахваліўся!

Нібыта на нейкае дзіва, глядзеў я на жывога праслаўленага класіка, на шырокі лоб, на вялікія моцныя рукі — рукі старанных, шчырага працаўніка. З-пад нахмураных броў свяцілася ў яго ясных вачах добразычлівая ўсмешка. Шчырасць, сардэчнасць паэта кранулі маё сэрца. Не проста ішоў, нібы на крылах ляцеў у рэдакцыю; здавалася мне, што ўсе ўжо ведаюць, што я быў у Коласа, гаварыў з вялікім паэтам...

Лютая вайна і Якуба Коласа выгнала з роднага Мінска. Цяжкія дарогі завялі яго ў далёкі Ташкент. Аднак і там, і ў тыя горкія дні не спыняў паэт творчай працы. У газету «Савецкая Беларусь», якая выдавалася тады ў Маскве для беларускіх партызан, для раёнаў у тыле ворага, Колас часта дасылаў вершы, поўныя гневу, нянавісці да акупантаў, поўныя любві да свайго народа, да бацькаўшчыны. Кожны ліст, кожны коласаўскі верш былі вялікай радасцю для нас, работнікаў рэдакцыі. А яшчэ большая радасць была, калі сам паэт прыехаў у Маскву, каб быць бліжэй да роднага краю, да Мінска.

Пасля вайны часта бываў я на кватэры паэта, чытаў яму свае вершы, паэмы, а ён уважліва слухаў, па-бацькоўску, клапатліва раіў, дзе што паправіць, удасканаліць. Ён заўсёды гаварыў, што аўтар сам павінен перажыць, адчуць добра тое, пра што піша, павінен аддаць свайму твору ўвесь агонь сэрца, усю цеплыню душы. Толькі тады, гаварыў ён, будзе сапраўднае мастацтва, якое ўсхвалюе сэрцы людскія, толькі тады паэзія стане голасам народа...

Гэтаму запавету быў заўсёды верны сам Якуб Колас...

Прыгадваецца такое: у Каралішчавічах, дзе цяпер Дом творчасці імя паэта, прайшоў цёплы дожджык-грыбасей. Дзядзька Якуб зняў з ног камашы і босы пайшоў па мокрай траве, па сырой лясной сцяжыне.

— Праз падэшву, — гаварыў ён, — не адчуеш усёй свежасці і ласкі, усёй сілы зямлі. А босай нагою нават пяшчотнае дыханне яе адчуваеш...

І ўявіўся мне тады ён пастушком-падлеткам, які босы бяжыць сцежкамі лугавымі да «светлага, чыстага, як з расы» Нёмана, бяжыць у ягады, грыбы, арэхі... Гадаваўся, падрастаў хлопчык, узмужнеў, стаў Коласам. Набіраўся сіл, наліваўся сонцам, жыццём Колас. Залатыя зярняты-песні купаў у сонцы і зорках. Шчодра ў людскія сэрцы сыпануў свой багаты залаты ўраджай родны Колас!..

І хоць яго няма сёння паміж нас, ён жыве ў сваіх цудоўных творах, у нашых сэрцах. Ён зрабіўся сам вялікаю, шырокаю песняю, якая акрыляе сэрцы нашы, уздымае, калыша крылы нашага імклівага паходу ў ясную будучыню.

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

АБ ПРЫСВАЕННІ ГАНАРОВЫХ ЗВАННЯЎ РАБОТНІКАМ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА РЭСПУБЛІКІ

За заслугі ў развіцці беларускай савецкай літаратуры і мастацтва прысвоіць ганаровыя званні:

НАРОДНАГА АРТЫСТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

Браварскай Зінаідзе Іванаўне — артыстцы Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы.

Волкаву Георгію Андрэевічу — галоўнаму рэжысёру Брэсцкага абласнога драматычнага тэатра імя ЛКСМ Беларусі.

Яроменку Мікалаю Мікалаевічу — артысту Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы.

Кімбергу Якаву Мікалаевічу — артысту Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра.

Заранок Таццяне Філіпаўне — артыстцы Брэсцкага абласнога драматычнага тэатра імя ЛКСМ Беларусі.

Макаравай Галіне Клімянцьеўне — артыстцы Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы.

Тарасаву Віктару Паўлавічу — артысту Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы.

Янкоўскаму Расціславу Іванавічу — артысту Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра Беларускай ССР імя М. Горкага.

НАРОДНАГА МАСТАКА БЕЛАРУСКАЙ ССР

Нікалаеву Яўгену Дзмітрыевічу — галоўнаму мастаку Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа.

ЗАСЛУЖАНАГА ДЗЕЯЧА МАСТАЦТВАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР

Бераву Маісею Залманавічу — кінааператару Мінскай кінастудыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў.

Забалоцкаму Анатолю Дзмітрыевічу — кінааператару студыі «Беларусьфільм».

Карпілаву Віктару Рыгоравічу — галоўнаму рэжысёру студыі Беларускага тэлебачання.

Кузняцову Івану Іванавічу — кампазітару.

Лейтману Льву Мееравічу — мастаку.

Паплаўскаму Канстанціну Іосіфавічу — музычнаму кіраўніку Дзяржаўнага народнага хору Беларускай ССР.

ЗАСЛУЖАНАГА ДЗЕЯЧА КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР

Бачылу Аляксандру Мікалаевічу — пісьменніку.

Калітоўскай Клаўдзіі Фёдараўне — дырэктару Беларускага дзяржаўнага харэаграфічнага вучылішча.

Каландзёнку Анатолю Іосіфавічу — дырэктару Беларускай дзяржаўнай ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармоніі.

Міхалюту Івану Францавічу — дырэктару Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра.

Пржыбытка Міхаілу Іванавічу — загадчыку пастановачнай часткай Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы.

ЗАСЛУЖАНАГА АРТЫСТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

Аляксандраву Сямёну Іосіфавічу — артысту Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра.

Бурковічу Веніяміну Антонавічу — салісту Дзяржаўнага народнага аркестра Беларускай ССР.

Вуячычу Віктару Лук'янавічу — артысту Беларускай дзяржаўнай ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармоніі.

Гур'еву Віктару Фёдаравічу — салісту Беларускага дзяржаўнага ордэна Леніна акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета.

Яфрэменку Аляксею Антонавічу — артысту Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра.

Захарэвіч Марыі Георгіеўне — артыстцы Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы.

Зубрычу Дзмітрыю Іванавічу — салісту Беларускай дзяржаўнай ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармоніі.

Івановай Дзіне Іванаўне — артыстцы Магілёўскага абласнога тэатра музычнай камедыі.

Калашнікаву Уладзіміру Аляксандравічу — артысту Дзяржаўнага тэатра лялек Беларускай ССР.

Клачко Георгію Якаўлевічу — артысту Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра Беларускай ССР.

Карнеевай Ніне Аляксееўне — артыстцы Гомельскага абласнога драматычнага тэатра.

Левіну Барысу Міхайлавічу — артысту Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа.

Окалаву Вацлаву Сцяпанавічу — артысту Тэатра юнага гледача Беларускай ССР.

Пятровай Марыне Уладзіміраўне — салістцы Беларускага дзяржаўнага ордэна Леніна акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета.

Раеўскаму Ігару Іванавічу — начальніку-мастацкаму кіраўніку ансамбля песні і пляскі БВА.

Рачову Анатолю Аляксандравічу — канцэртмайстру аркестра Беларускага дзяржаўнага ордэна Леніна акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета.

Рудакову Анатолю Абрамавічу — артысту Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра.

Слаўкову Уладзіміру Іванавічу — артысту Гомельскага абласнога драматычнага тэатра.

Табашнікаву (Зорыну) Мікалаю Анхілафіевічу — артысту Беларускай дзяржаўнай ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармоніі.

Цімафеевай Людміле Яфімаўне — артыстцы Тэатра юнага гледача Беларускай ССР.

Токараву Генадзю Барысавічу — артысту Брэсцкага абласнога драматычнага тэатра імя ЛКСМ Беларусі.

Фядзяевай Ніне Рыгораўне — артыстцы Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра.

Філіпаву Пятру Паўлавічу — артысту Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра.

Філіпаву Раману Сяргеевічу — артысту Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы.

Чахоўскаму Леаніду Станіслававічу — салісту балета Беларускага дзяржаўнага ордэна Леніна акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета.

Юзэфовіч Людміле Іванаўне — салістцы Беларускага дзяржаўнага ордэна Леніна акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
В. КАЗЛОЎ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
Д. ЛУКАШЭВІЧ.

30 кастрычніка 1967 года,
гор. Мінск.

З ВЫСОКАЙ УЗНАГАРОДАЙ!

За поспехі, дасягнутыя ў развіцці беларускай савецкай літаратуры і мастацтва, Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР Указам ад 30 кастрычніка 1967 года ўзнагародзіў:

ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

Абеліёвіча Льва Майсеевіча — кампазітара, **Аўдзеева Алега Ціханавіча** — кінааператара студыі «Беларусьфільм», **Аляксеева Мікалая Іванавіча** — пісьменніка, **Алешка Антона Антонавіча** — пісьменніка, **Браценікава Мікалая Данілавіча** — загадчыка струннай кафедры Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, **Бураўкіна Генадзя Мікалаевіча** — пісьменніка, **Бурдзялёва (Русецкага) Аляксея Сцяпанавіча** — пісьменніка, **Вагнера Генрыха Матусавіча** — кампазітара, **Вялюгіна Анатоля Сцяпанавіча** — пісьменніка, **Валадарскага Барыса Саламонавіча** — галоўнага рэжысёра Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра, **Вольскага-Зэйдэля Віталя Фрыдрыхавіча** — пісьменніка, **Воранава Натана Майсеевіча** — мастака, **Гілевіча Ніла Сямёнавіча** — пісьменніка, **Ганчарэнка Надзею Мацвееўну** — артыстку Брэсцкага абласнога драматычнага тэатра імя ЛКСМ Беларусі, **Грахоўскага Сяргея Іванавіча** — пісьменніка, **Грамыку Віктара Аляксандравіча** — мастака, **Гуціева Мікалая Цімафеевіча** — мастака, **Давідовіча Ісаака Аронавіча** — мастака, **Дадзішкіліяні Атара Міхайлавіча** — галоўнага балетмайстра Беларускага дзяржаўнага ордэна Леніна акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета, **Данелія Пятра Аляксеевіча** — мастака, **Данілюк Святлану Піліпаўну** — салістку Беларускага дзяржаўнага ордэна Леніна акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета, **Дугашава Газіза Ніязавіча** — галоўнага дырыжора Беларускага дзяржаўнага ордэна Леніна акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета, **Загароднага Георгія Мікалаевіча** — інструктара аддзела культуры ЦК КП Беларусі, **Казеку Івана Дарафеевіча** — крытыка, **Каплана Абрама Гаўрылавіча** — артыста Гомельскага абласнога драматычнага тэатра, **Карпава Уладзіміра Барысавіча** — пісьменніка, **Кашкурэвіча Арлена Міхайлавіча** — мастака, **Кірэенку Канстанціна Ціханавіча** — пісьменніка, галоўнага рэдактара часопіса «Бярозка», **Кірычэнку Віктара Лук'янавіча** — салісту Беларускага дзяржаўнага ордэна Леніна акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета, **Клімаву Аляксандру Іванаўну** — артыстку Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра Беларускай ССР імя М. Горкага, **Кавалёва Паўла Нікіфаравіча** — пісьменніка, галоўнага рэдактара часопіса «Полымя», **Казлоўскага Аляксандра Сцяпанавіча** — мастака, **Корбана Уладзіміра Іванавіча** — пісьменніка, галоўнага рэдактара часопіса «Вожык», **Касмачова Канстанціна Міхайлавіча** — мастака, **Крысько (Вітку) Цімафея Васільевіча** — пісьменніка, галоўнага рэдактара часопіса «Вясёлка», **Кубельскую Валянціну Іосіфаўну** — загадчыцу рэквізітарскім цэхам Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы, **Кудрэвіч Раісу Уладзіміраўну** — мастачку, **Кузьменка Матрону Іванаўну** — артыстку Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра Беларускай ССР імя М. Горкага, **Кулакоўскага Аляксея Мікалаевіча** — пісьменніка, **Лобана Мікалая Паўлавіча** — пісьменніка, **Лакштанаву Ільзу Канстанцінаўну** — артыстку Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра Беларускай ССР імя М. Горкага, **Лукавецкага Мірона Яраслававіча** — галоўнага рэжысёра Мінскага цырка, **Лучанка Ігара Міхайлавіча** — кампазітара, **Лынькова Міхаіла Ціханавіча** — пісьменніка, **Макаёнка Андрэя Ягоравіча** — пісьменніка, галоўнага рэдактара часопіса «Неман», **Мальцінскага Хаіма Ізраілевіча** — пісьменніка, **Мартынава Георгія Раманавіча** — балетмайстра, саліста Дзяржаўнага ансамбля танца Беларускай ССР, **Масальскага Рыгора Ігнацьевіча** — кінааператара Мінскай кінастудыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў, **Маслава Мікалая Фёдаравіча** — дацэнта кафедры харавога дырыжыравання Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, **Машару Міхаіла Антонавіча** — пісьменніка, **Міцуля Эдуарда Леанардавіча** — саліста Беларускай дзяржаўнай філармоніі, **Маўзона Аркадзя (Маўшанзона Арона Іосіфавіча)** — пісьменніка, **Мазалёва Аляксандра Пятровіча** — мастака, **Навуменку Івана Якаўлевіча** — пісьменніка, **Абуховіч Ганну Браніславаўну** — артыстку Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра Беларускай ССР імя М. Горкага, **Асіпенку Аляксандра Харытонавіча** — пісьменніка, галоўнага рэдактара часопіса «Маладосць», **Асмалоўскую Зою Васільеўну** — артыстку Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра Беларускай ССР імя М. Горкага, **Паліводу Ігара Пятровіча** — начальніка ўпраўлення па справах мастацтваў Міністэрства культуры Беларускай ССР, **Пашкевіча Нічыпара Еўдакімавіча** — крытыка, галоўнага рэдактара газеты «Літаратура і мастацтва», **Пестрака Піліпа Сямёнавіча** — пісьменніка, **Роўду Віктара Уладзіміравіча** — загадчыка кафедры харавога дырыжыравання Беларускай Дзяржаўнай кансерваторыі, **Рынковіч Алену Васільеўну** — артыстку Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы, **Семяжонава Іосіфа Ігнатавіча** — пісьменніка, **Семяняку Юрыя Уладзіміравіча** — кампазітара, **Смоліча Дзмітрыя Мікалаевіча** — галоўнага рэжысёра Беларускага дзяржаўнага ордэна Леніна акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета, **Станюту Стэфанію Міхайлаўну** — артыстку Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы, **Стальмашонка Уладзіміра Іванавіча** — мастака, **Стральцова Уладзіміра Міхайлавіча** — рэжысёра Мінскай кінастудыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў, **Цікоцкага Яўгена Карлавіча** — кампазітара, **Ткачова Мікалая Гаўрылавіча** — пісьменніка, сакратара Саюза пісьменнікаў Беларускай ССР, **Фёдарава (Янку Маўра) Івана Міхайлавіча** — пісьменніка, **Федчанку Ларысу Мікалаеўну** — артыстку Магілёўскага абласнога тэатра музычнай камедыі, **Хадкевіча Тараса Канстанцінавіча** — пісьменніка, **Царова Аляксея Андрэевіча** — артыста Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра, **Чамадурава Яўгенія Рыгоравіча** — галоўнага мастака Беларускага дзяржаўнага ордэна Леніна акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета, **Шыбнёва Анатоля Дзям'янавіча** — мастака, **Шкапскага Алега Барысавіча** — артыста Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра Беларускай ССР імя М. Горкага, **Шкрабу Рыгора Васільевіча** — крытыка, **Якімовіча Аляксандра Іванавіча** — пісьменніка.

ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР:

Аўрамчыка Мікалая Якаўлевіча — пісьменніка, **Анікейчыка Анатоля Аляксандравіча** — скульптара, **Багуслаўскую Нэлі Захараўну** — салістку Беларускай дзяржаўнай філармоніі, **Барадуліна Рыгора Іванавіча** — пісьменніка, **Бржазоўскую Ксенію Іосіфаўну** — артыстку Дзяржаўнага народнага аркестра Беларускай ССР, **Уласава Уладзіслава Пятровіча** — артыста Дзяржаўнага тэатра лялек Беларускай ССР, **Гарбука Генадзя Міхайлавіча** — артыста Беларускага Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы, **Давідовіч Лілію Міхайлаўну** — артыстку Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы, **Данцыга Мая Вульфавіча** — мастака, **Дубава Георгія Савельевіча** — артыста Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа, **Ігнацьева Яўгенія Аляксеевіча** — мастака кінастудыі «Беларусьфільм», **Кавальчука Уладзіміра Мікалаевіча** — саліста Дзяржаўнага народнага хору Беларускай ССР, **Маленчанка Рыму Фёдараўну** — артыстку Тэатра юнага гледача Беларускай ССР, **Масцерава Пятра Іванавіча** — артыста Магілёўскага абласнога тэатра музычнай камедыі, **Мурахвера Уладзіміра Сямёнавіча** — мастака шклозавода «Нёман», **Арлову Галіну Аляксандраўну** — артыстку Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы, **Пташнікава Івана Мікалаевіча** — пісьменніка, **Ржэвускага Віктара Іпалітавіча** — артыста Беларускай дзяржаўнай філармоніі, **Раговіча Уладзіміра Іосіфавіча** — дырыжора Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы Беларускай ССР, **Рыжкову Ганну Паўлаўну** — артыстку Беларускай дзяржаўнай філармоніі, **Савіцкага Аляксандра Ануфрыевіча** — пісьменніка, **Сачанку Барыса Іванавіча** — пісьменніка, **Стэфанаву Людмілу Пятроўну** — салістку Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы Беларускай ССР, **Стральцова Міхаіла Лявонавіча** — пісьменніка, **Цвятаеву Яўгенію Віктараўну** — салістку Беларускай дзяржаўнай філармоніі, **Шаўкалюка Віктара Раманавіча** — артыста Магілёўскага абласнога тэатра музычнай камедыі, **Шубіну Людмілу Мікалаеўну** — салістку Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

Пачаў тады мой Брызгалін без каня на хаду гарцаваць. Перад кожным на свой лад: перад наведвальнікамі, перад начальствам. І стаў гэты персанаж адрозніваецца ад іншых прайдзісветаў, якіх даводзілася мне іграць: ён і сапраўды, як я адчуваў, збіраўся пражыць гарцуючы...

Калі гаварыць пра непасрэдны ўплыў на сцэнічную работу пабачанага мною ў час службы ў Бабруйску пры Поарме 16, дык раней за ўсё назаву ролю камэска Дыбава ў «Міжбур'і» Д. Курдзіна. Нібы ўрачыстую чырвонаармейскую «Адысею» ўзрушана дэкламаваў я, калі чытаў маналог: «Скачам гэта мы з грамадою па ўкраінскіх стэпах, па беларускіх сёлах, яблычкам па Расіі перакочваемся. Эскадронамі, палкамі, брыгадамі ціснем зграю золатапагонную, па ўсяму фронту з музыкай у вёску ўлятаем. Мужыкі рукі ціснуць, бабы пампушкамі частуюць, дзеўкі цалавацца лезуць... А Сямён Міхайлавіч Будзённы толькі крычыць: «У атаку! Наперад, наперад! Сячы!» — выхапіўшы шаблю, я ўскокваю на стол, і мой Дыбаў амаль што спявае: — Дым... агонь... страляніна... заваруха. У Расіі страляюць — у Амерыцы чутна. Давай!»

Колькі такіх Дыбавых у грамадзянскую вайну прайшло перад маімі вачыма — у Оршы, Барысаве, Рагачове, Асіповічах! Я курыў разам з імі махорку ў цяплушках з маршавымі ротамі, стаяў у чарзе за «сухім пайком», патрабаваў, каб «наш» эшалон тэрмінова выпусцілі за семафор, — таму, мабыць, мне так лёгка было знайсці сябе «ў Дыбаве» і Дыбава «ў сабе». Здаралася, падыходзіў я перад тым, як выйсці на сцэну, да люстра за кулісамі і, шчыра прызнаюся, адчуваў самога сябе заўзятым кавалерыстам, «пропахшим мятой ночлегов и горечью махорки», як сказана ў Э. Багрыцкага...

Вось я гартаю ў думках старонкі роляў, што былі сыграны мною на сцэне тэатра, якому аддадзена ўсё маё творчае жыццё, і зноў бачу, як паслядоўна знітавана была дзейнасць нашага калектыву з тым, што адбывалася ў краіне. Паспрабаваў падлічыць — атрымліваецца прыблізна дзвесце пяцьдзесят спектакляў за сорак сем гадоў! Ці ж трэба даводзіць, што сыграць ва ўсіх, карыстаючыся толькі эмацыянальнай памяццю, запасам уласных назіранняў і дапамогай рэжысёраў, мы б не змаглі.

Скажам, мне ў 1924 г. даручылі ролю слугі Каўеля ў мальераўскім спектаклі «Мешчанін у дваранстве», дзе я разам з Вольгай Галінай, Барысам Платонавым, Генрыхам Грыгонісам і Кацярынай Міронавай, як гаварылася ў «Пралогу» да спектакля, «першы раз лапці і сярмягу, і андарак змянілі на мальераўскае ўбранне. Хай кожны ведае, тэатр наш беларускі не адкідае прэч і класікі французскай...»

Чаго толькі ні рабілі мы — нават цыркавыя сальта-мартале! Трэба было шукаць мастацкае апраўданне кожнаму, нават самаму эксцэнтрычнаму і гратэскаваму кроку на сцэне. І тут Міровіч навучыў нас абуджаць у сабе творчае ўяўленне. «Вока і вуха ды яшчэ ў дадатак — фантазія — вось табе і артыст», — з усмешкай гаварыў рэжысёр; і хоць далёка не кожнае «сальта» і не кожны «фляк» мы маглі тады ўнутрана падрыхтаваць і нават зразумець, навошта яны, але фантазія наша ўсё ж, як я мяркую, працавала плённа...

Акцёры-кулалаўцы не павінны забываць, што вялікай школай для іх з'яўляюцца і непасрэдныя творчыя кантакты з драматургамі. Нельга, вядома, усе поспехі нашага тэатра зводзіць да адной якой-небудзь прычыны ці асобы. Аднак давайце ўспомнім найбольш яркія ўзлёты — «Кастусь Каліноўскі» з Уладзімірам Крыловічам у галоўнай ролі, «Гута», «Мост», «Бацькаўшчына», «Партызаны», «Хто смяецца апошнім»... Абарву на гэтым спіс, бо ён будзе вельмі доўгі, калі пералічваць усе значныя спектаклі, створаныя калектывам сумесна з драматургамі (дарэчы, і над «Браняпоездам 14-69» мы працавалі ў кантакце з Ус. Іванавым). Аўтары — розныя па ўзроўню свайго таленту і па свайму творчаму тэмпераменту — неслі ў тэатр не толькі тэкст той або іншай драмы ці камедыі, яны прыходзілі да нас са сваім філасофскім роздумам і сваімі жыццёвымі назіраннямі, толькі частка з якіх адлюстравалася ў персанажах і канфліктах п'есы. У нашых спрэчках з імі, у тых «допытах», якія выканаўцы роляў наладжвалі аўтарам, перад артыстамі адкрываліся новыя гарызонты жыцця.

Драматургі нібы падкідалі ў агонь нашай творчай цікаўнасці да ролі жыццёвае паліва. Уяўленне тады больш канкрэтна малявала перад намі пэўныя постаці: сёння — Каліноўскага, які складае чарговы нумар «Мужыцкай праўды», заўтра — сутычку рабочых і інжынераў з бюракратамі, далей — тра едыю і радасці сям'і Леапольда Гушкі, потым — цішыню акадэмічных аўдыторый, дзе Туляга спрабуе даць бой Гарлахвацкаму... А як гэта адбываецца, хто яны такія, героі гэтых твораў, чаму ім трэба дамагацца гэтага і гэтага — на ўсе гэтыя пытанні (падрабязна, а часам у некалькіх словах) адказвалі нам Міровіч, Кобец, Рамановіч, Чорны, Крапіва. Паасобку кожны з іх як быццам бы садзейнічаў поспеху ў працы толькі над «сваім» спектаклем, але ўсе сустрэчы трупы купалаўцаў з драматургамі, калі іх узяць разам, якасна ўплывалі на станаўленне тэатральнага мастацтва вялікай жыццёвай праўды. Літаратура навучыла нас разумець веліч звычайнага чалавека з народа, калі ён узнімае свой голас у абарону праўды, супраць прыгнёту.

Да гэтага часу мы адносім «Бацькаўшчыну» К. Чорнага да выдатных сцэнічных твораў нашага рэпертуару (добра зрабілі ў Віцебску, што зноў паставілі яе). Я іграў у спектаклі ролю Леапольда Гушкі. Складаны ў яго жыццёвы шлях, няпростая псіхалагічная «лінія паводзін», ёсць нешта ў гэтым характары і непахіснае, і рухомае. Вядома, я ўчытваўся ў раман, шукаючы — які ён у Кузьмы Чорнага, і які ў маім акцёрскім уяўленні. Думаў, думаў пра Леапольда, падыходзіў да люстэрка, прымяраў вусы розныя, бровы, з гумозу насы рабіў. Сам не ведаю — чаму, але аднойчы, прамовіўшы ўголас рэпліку Гушкі: «Хоць у вір галавой кідайся! А чалавек хіба на тое родзіцца на свет, каб у вір галавой кідацца? Чалавек родзіцца, каб жыць...», я сам адчуў, што ў яго павінны быць густыя бровы над самымі вачыма, у якіх гарыць вось гэтая думка («Каб жыць!..»), і што ён нібы хавае свой позірк «пад брывамі». Потым «знайшоў» і вусы, у якіх лёгка такому чалавеку затаіць і здзеклівую ўсмешку, і пакутлівы выраз.

Мне тады не было і сарака, а герою майму было ўжо больш за пяцьдзесят — і грым раптам дапамог мне адчуць «вагу ўзросту». Праўда, і грым, і паходка, і рытм мовы — усё гэта яшчэ не дае нам упэўненасці: маўляў, гэта ўжо ён, Леапольд Гушка. Выпісаў я з рамана (ды і сам «навыдумляў» тое-сёе) падрабязную біяграфію чорнаўскага героя. Вось пасля такой працы мне ўжо было не сорамна размаўляць пра Гушку з Чорным, як кажуць, на роўных. Ён мяне аднойчы нават спытаў: «А ці не з'ездзілі вы, таварыш Уладамірскі, учора ў Капыль на кірмаш? Нешта новае ў вас чуецца ў слове — скіньце...» А я тады яму паказваў, як буду на сцэне гукаць Гушкаў заклік — «Скіньце вы ўсё тое, што жывога чалавека ў зямлю гняце... Скіньце вы цара гэтага!..» Сам прыслухаўся — і сапраўды «скічьце» гучыць у мяне неяк асабліва па-капыльску, магчыма.

*Сярод шмат

ГОД ТВОРЧАГА ЎЗДЫМУ

Сёлетні год у культурным жыцці Брэстчыны быў асаблівы: прайшлі юбілейныя агляды мастацкай самадзейнасці, справаздачы самадзейных кампазітараў і мастакоў, скульптараў і майстроў керамікі, разбяроў па дрэву і інкрустатараў, ткачых і вышывальшчыц. Шмат вартага ўвагі было і ў рабоце нашых культасветустаноў.

Пачалі мы з самага неабходнага і важнага — умацавання кадраў раённых дамоў культуры. Пры абласным інстытуце павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры арганізавалі спецыяльныя курсы перападрыхтоўкі, адкрылі дзесяцімесячныя курсы для кіраўнікоў калектываў мастацкай самадзейнасці, а пры абласным Доме народнай творчасці — метадычны кабінет. Нямала здольных спецыялістаў было паслана на раён і ў сяло пасля заканчэння культасветвучылішчаў. Вымушала нас усур'ёз брацца за кадры і тое, што сёлета ў калгасах будавалася 117 клубаў і дамоў культуры, адкрылася 35 новых бібліятэк, дзве музычныя школы.

Я мог бы прывесці лічбы праведзеных установамі культуры мерапрыемстваў. Але сутнасць усё-такі не ў іх, а ў якасных зменах у рабоце клубаў, дамоў культуры, бібліятэк. Прапаганда велічных дасягненняў Савецкай краіны, выхаванне працоўных і асабліва моладзі на патрыятычных прыкладах з жыцця і дзейнасці ветэранаў рэвалюцыі і мірнай працы стала галоўным напрамкам іх работы. Вечары на тэмы «Дарогай бацькоў», «Імем рэвалюцыі», «Вечна жывыя» прайшлі літаральна ва ўсіх клубах, найбольш цікава і мэтанакіравана — у Падлескім, Навасёлкаўскім, Лышчыцкім, Падгорнаўскім, Роўбіцкім сельскіх клубах, у Кобрынскім, Целяханскім, Пінскім і іншых дамах культуры.

Цікава праведзены сумесна з установамі культуры суседніх украінскіх раёнаў вечары дружбы народаў у Столінскім, Лунінецкім, Маларыцкім і іншых раёнах. У Баранавіцкім раёне ва ўсіх калгасах прайшлі тыдні рэвалюцыйнай песні. У час гэтых тыдняў выступалі харавыя калектывы, музычныя ансамблі і аркестры, дэманстраваліся лепшыя фільмы аб Кастрычніку і У. І. Леніне, наладжваліся сустрэчы з ветэранамі рэвалюцыі. Напярэдадні пяцідзесяцігоддзя адбудзецца ўрачысты фінал — раённае свята песні. Такія святы пройдуць і ў іншых раёнах.

У Ляхавіцкім раёне кожны тыдзень у аддаленыя вёскі выязджала агіткалона з канцэртнай брыгадай, кінаперасоўкай, духавым аркестрам, аўтакрамай, перасоўнай майстэрняй камбіната бытавога абслугоўвання. Кожны прыезд брыгады быў для жыхароў сяла сапраўдным святам.

Масавыя святы, народныя гулянні наладжваліся ў вобласці і раней. Сёлета яны набылі форму тэатралізаваных прадстаўленняў з удзелам не толькі мастацкай самадзейнасці горада і вобласці, а і калектываў з Мінска, Кіева, Луцка і Люблінскага ваяводства Польскай Народнай Рэспублікі. Адно з такіх свят, прысвечаных Кастрычніку, закончылася выступленнем дзвюх тысяч чалавек.

У ходзе падрыхтоўкі да ўсесаюзнага фестывалю самадзейнага мастацтва ў калектывы прыйшло каля трынаццаці тысяч новых выканаўцаў, арганізавалася каля трохсот новых гурткоў. Характэрна, што многія калектывы значна вырасліі творча. За высокае выканаўчае майстэрства і шматгадовую дзейнасць драматычнаму калектыву Целяханскага Дома культуры Іванцэвіцкага раёна прысвоена ганаровае званне «Народны тэатр». Многія танцавальныя і харавыя калектывы аб'ядналіся ў ансамблі. Узнікла 65 сельскіх духавых аркестраў. Ставіцца задача, каб у бліжэйшыя пяць гадоў такія аркестры былі ва ўсіх калгасах вобласці.

Усё больш глыбока пранікае ў культурнае жыццё вобласці прафесіянальнае мастацтва. На падмостках сельскіх сцэн сёлета паказана звыш тысячы канцэртаў і спектакляў артыстаў-прафесіяналаў. Цяжка пераацаніць каштоўнасць выездаў майстроў мастацтва на сяло: тут і шырокае азнаямленне сельскіх працаўнікоў з дасягненнямі культуры нашай рэспублікі, брацкіх народаў і зарубежных краін, і наглядныя ўрокі майстэрства для самадзейных калектываў, і непасрэдная дапамога ў арганізацыі іх работы. Наш абласны драматычны тэатр імя ЛКСМБ арганізаваў тры выязныя трупы, паставіў у калгасах і саўгасах 160 спектакляў. Пры ім створаны лялечны калектыў, які за няпоўны год паказаў дзецям каля трохсот спектакляў.

Актыўна ўключыліся ў выхаваўчую работу і нашы бібліятэкі. Бібліятэчнымі кнігамі цяпер карыстаюцца больш за паўмільёна жыхароў вобласці. Мы неяк падлічылі, што толькі за дзесяць месяцаў яны прачыталі больш за шэсць мільёнаў кніг. У Пружанскім, Камянецкім, Ляхавіцкім і іншых раёнах кніга, як кажуць, «даведзена да кожнага чытача».

Шырока разгарнулі бібліятэкі краязнаўчую работу. Але найбольш поўна матэрыялы аб гісторыі роднага краю сабраны ў шматлікіх калгасных і школьных музеях, якія адкрыліся сёлета. Многія з іх сталі сапраўднымі школамі патрыятызму, мужнасці і гераізму...

Я спыніўся толькі на некаторых баках культурнага жыцця вобласці ў юбілейным годзе. А яно ў нас шматграннае і паўнакроўнае. Год 50-годдзя Кастрычніка стаў для культасветустаноў Брэстчыны часам творчага ўздыму.

М. ШАЎЧУК,
начальнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення культуры.

ЧУЦЕН ГОЛАС НАШ ДАЛЁКА

ПА ЎСЁЙ ПЛАНЕЦЕ

□ У сувязі з 50-годдзем Вялікага Кастрычніка, мерапрыемствы, прысвечаныя Беларусі, пройдуць у Алжыры, Мексіцы, Уругваі, Інданезіі, Нігерыі, Занзібары, на Маўрыкіі, у Калумбіі, Новай Зеландыі.

□ *У Таварыстве кіпра-савецкай дружбы адбыўся вечар, прысвечаны Беларускай ССР, адзін з многіх, якія праводзяць кіпрскія прагрэсіўныя арганізацыі ў гонар 50-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.*

□ У розных гарадах Індыі арганізаваны тры вялікія фотавыстаўкі, якія расказваюць аб нашай рэспубліцы.

□ У Аўстраліі падрыхтоўка да святкавання 50-годдзя Кастрычніка пачалася яшчэ летась. На працягу юбілейнага года ў Сіднеі, Мельбурне і іншых гарадах арганізоўваліся выстаўкі, прысвечаныя ўсім рэспублікам Савецкага Саюза.

Для правядзення вечара, прысвечанага Беларусі, у Аўстралію накіраваны фотаматэрыялы, нацыянальныя касцюмы, кнігі, альбомы.

□ *Выстаўка «Савецкая Беларусь за 50 гадоў Савецкай улады» адкрыецца ў Амерыкана-рускім інстытуце ў Сан-Францыска.*

У ВЯЛІКІМ МІЛАНСКІМ ПАЛАЦЫ

25 кастрычніка ў Мілане адкрыўся «Тыдзень Савецкага Саюза». Адна з залаў вялікай выстаўкі, якая размешчана ў Вялікім міланскім палацы і паказвае поспехі ўсіх 15 савецкіх рэспублік, расказвае пра Беларусь. Наведвальнікі могуць пазнаёміцца ў ёй з фотавыстаўкай «Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка», выстаўкай кніг беларускіх пісьменнікаў, альбомамі, буклетамі, нацыянальнымі касцюмамі, вырабамі народнай творчасці.

У гэтыя дні ў Італіі будуць дэманстравацца дакументальныя фільмы «Вызваленне Беларусі», «Беларуская сюіта» і «Мой горад».

МАСТАЦКАЕ ПРЫВІТАННЕ ГОРАДУ-ПАБРАЦІМУ

У горадзе-пабраціме Мінска Ноцінгеме (Англія) адбылася выстаўка карцін беларускіх мастакоў, на якой экспанавалася 51 работа 36 аўтараў. Выстаўка прыцягнула ўвагу шырокай грамадскасці і стаўла ацэнка прэсай. Так, напрыклад, газета «Іўнінг пост энд ньюз» пісала аб экспазіцыі: «Праўдзівыя карціны, якія расказваюць аб жыцці і адлюстроўваюць яго без усялякай прэтэнцыёзнасці».

Ноцінгемскае аддзяленне таварыства англа-савецкай дружбы выказала глыбокую падзяку за выстаўку і лічыць што яна з'явілася адным з важных мерапрыемстваў у Англіі ў сувязі з 50-годдзем Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.



На здымку: англічане знаёмяцца з карцінамі беларускіх мастакоў.

ПЕСНЯ МАЯ, БАЛКАРЫЯ!

ДА 50-ГОДДЗЯ КАЙСЫНА КУЛІЕВА

Заўтра спаўняецца 50 гадоў выдатнаму савецкаму паэту Кайсыну Куліеву. Яго цудоўныя лірычныя мініяцюры, вершы і паэтычныя цыклы, у якіх апяваецца радасць новага жыцця, сцвярджаюцца ідэі братэрства і дружбы народаў, «Горская паэма пра Леніна», якая ўслаўляе веліч ленінскіх ідэй і народных здзяйсненняў, апошнія зборнікі вершаў «Зямля і песня», «Агонь на гары», «Паранены камень» — вядомыя ўсёй савецкай краіне, іх ведаюць і любяць і чытачы Беларусі.

Кайсын КУЛІЕЎ

■ ■ ■

Усё было! Дні ўдач і дні нягод.
Бываў і лёгкім, і пакутным шлях—
Вясёлка часам клікала ў паход,
Парой маланкі гойсалі ў палях.

Я тым не друг, хто прагне маладосць
Правесці ў бесклапотнасці, пірах.
Я свет люблю такім, які ён ёсць, —
З травою і заносамі ў гарах.

Хай гора прыйдзе да дзвярэй маіх—
Што ж, галаву на рукі я ўраню,
Галодны, сяду з ліхам удваіх
Ля камінка, дзе ўжо няма агню.

Я толькі б аднаго ў жыцці не змог—
Не славіць вас, нябёсы і палі,
Прамень вячэрні, што вянчае стог,
Густыя росы ў веснавым галлі.

Сястру сваёй журбы і перамог,
Цнатлівую паперу я люблю
І словы тыя, што з любых дарог,
Як коні, на сваю імчаць зямлю.

Віну і хлебу ведаю цану.
І навальніцы, і вясёлцы рад.
Я слаўлю свет—і восень і вясну—
Яго сурова-ласкавы пагляд.

БЕТХОВЕН

Ён так пісаў, як быццам бы стварэў
Уласнаручна горы. І, высокі,
Грувасцію глыбы, скалы прымяраў,
А па начах блукаў тут, адзінокі.

Ён кожны дзень, уставшы на зары,
Любое мора мог адолець, пэўна,
Сягнуўшы праз цясніны і віры,—
Няўрымслівы, упэўнены і гнеўны.

Ён так пісаў, як быццам у руках
Трымаў штоночы зыркую маланку
І краты свету спапяляў у прах
Адзінай сваёй воляй— да світанку!

Так узыходзіў ён на вышыню
Гор рукатворных, дасягнуўшы мэты.
«Як толькі дабрату адну цаню!» —
Ён гаварыў, спазнаўшы змрок і беды.

■ ■ ■

Чужой бядой не кожны жыць умее,
Галодны сытага не разумее.

Не раз я быў усцешаны і біты.
Жыццё, ажыццяві маю надзею:
Кармі, як хочаш, каб не стаў я сытым,
Які галоднага не разумее.

Пераклад Сцяпана ГАЎРУСЁВА.

ГУЧЫЦЬ ГЕРОІКА НАШАГА ЧАСУ

СЕЗОН 1967-68

Канцэрт, які адбыўся 29 кастрычніка ў філармоніі, быў прысвечаны 50-годдзю Савецкай дзяржавы. Ён пачаўся кантатай Яўгена Глебава на словы М. Алтухова «Камуністы вядуць», якую выканалі Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР і хор Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па радыёвяшчанню і тэлебачанню. Потым прагучаў Канцэрт № 3 С. Прокоф'ева для фартэпіяна з аркестрам. Саліраваў народны артыст СССР Якаў Зак. Народны артыст СССР Аляксей Іваноў выканаў арыі з опер.

У другім аддзяленні ўпершыню прагучала «Альпійская сімфонія-балада» Яўгена Глебава.

Публіка цёпла вітала кампазітара і выканаўцаў.

На здымку: Л. Крука кампазітар Яўген Глебаў (у цэнтры) з удзельнікамі прэм'еры— дырыжорам Ю. Яфімавым (злева) і кіраўніком хору В. Роўдам.

ВОДГУЛЛЕ СУРОВЫХ ДЗЁН

Гэта адбылося ў цяжкія дні вайны. З фашысцкага лагера смерці ўцяклі двое — хлопец-беларус і дзяўчына-італьянка. У скалістай цясніне іх акружылі ворагі, і беларускі хлопец загінуў, абараняючы свабоду, каханне...

Аповесць Васіля Быкава, якая расказвала пра гэта, была экранізавана, прыцягнула ўвагу тэатра: святло рампы ўбачыў балет «Альпійская балада». І вось у Беларускай дзяржаўнай філармоніі прагучала «Альпійская сімфонія-балада».

Музыка яе ярка тэатральная і ўзнаўляе не толькі драматычныя абставіны сюжэта, характар і аблічча герояў, дынаміку іх руху і змену настрояў. У шматлікіх інструментальных дыялогах і асобных «выказваннях» перададзены розныя адценні мовы дзеючых асоб, складаная дыялектыка пачуццяў— ад роспачы да нараджэння надзеі, ад трагічнага здранцвення да светлай радасці.

Мноства гукавых (і нават зрокавых!) асацыяцый узнікае, калі слухаеш сімфонію. Тут і інтанацыі беларускай песеннасці (тэма-эпіграф і другая лірычная тэма трэцяй часткі); і мелодыя італьянскай тарантэлы; і напружаныя, трагічна дэкламацыйныя воклічы ў галоўнай тэме-маналогу; і галашэнні хору, які спявае без слоў...

Ёсць і асацыяцыі іншага плана: вось жорсткі і страшны «фашысцкі марш» — ён нібы «зманціраваны» з разрозненых абаротаў тэмы нашэсця са славутай Ленінградскай сімфоніі Шастаковіча, тэмы, якая, можна сказаць, зрабілася «сімвалам» фашызму. Вось імклівы бег струнных, дынаміка такатнага руху, якая ўсё нарастае і пранізвае ўсе часткі сімфоніі — як нагадвае гэта мноства падобных эпізодаў у сучасных, у тым ліку нашых беларускіх, сімфоніях, як яўна ідзе гэта ад такатэ Восьмай і эпізоду расстрэлу ў Адзінаццатай сімфоніі Шастаковіча!..

Аднак пры ўсім багацці канкрэтных асацыяцый нават адзін і той жа сюжэт можны мастак увасабляе сваімі сродкамі. У гэтым сэнсе, вядома ж, няма і не можа быць «узаемазамяняльнасці» мастацтваў.

І тут, на наш погляд, праяўляецца слабы бок «Альпійскай сімфоніі-балады» як твора канцэртна-сімфанічнага жанру. Тое, што ў музыцы балета натуральна перадавала той ці іншы стан сцэнічнага дзеяння, у сімфоніі часам выглядае неапраўданым, наўмысным (такія, напрыклад, кароткія фразы флейты-пікала, якія ў балеце характарызуюць выразны жэст гераіні, але незразумелыя і выпадаюць з агульнага кантэксту ў сімфоніі). Такая і фрагментарнасць, «кадравасць» фіналу сімфоніі, які працягвае, але не абагульняе развіццё (адсюль, відаць, уражанне, што фінал расцягнены). Бадай, найбольшай канструкцыйнай стройнасцю вызначаецца другая частка, дзе вабіць соеасаблівая, ціхая гучнасць хору, які спявае без слоў, і аргана — на фоне акампанементу струнных.

Неаднаразова гаварылася пра майстэрства арыестраванага развіцця ў Глебава. Яно бясспрэчна праявілася і ў «Альпійскай сімфоніі-баладзе», адчуваецца і ў разнастайнасці тэматычных трансфармацый (як пераасэнсоўваецца, напрыклад, тэма тарэнтэлы або асноўная тэма сімфоніі), у рэльефных, заўсёды драматургічна асэнсаваных поліфанічных спалучэннях, ва ўменні кампазітара актыўна развіваць матэрыял.

Багаццем, нават пышнасцю, вызначаецца тэмбравы бок сімфоніі. У ёй мноства эфектных сола, усялякіх вострых спалучэнняў, ёй уласцівая вялікая кампактнасць, бляск і сіла гучання. Толькі, трошкі празмерна настойлівым, «традыцыйна-балетным» (што надае тэмам адценне залішняй прыгажосці) здаецца нам звяртанне да гучнасці арфы, званочкаў, чэлесты і скрыпічкі сола ў лірычных момантах музыкі. Некаторае незадавальненне выклікае і сам лірычны тэматызм сімфоніі; за выключэннем пяцідольнай тэмы ён, на наш погляд, недастаткова разгорнуты і не заўсёды ярка індывідуальны.

Выканаўчы калектыў — аркестр Беларускай дзяржаўнай філармоніі (дырыжор Юрый Яфімаў), аб'яднаны хор радыё і кансерваторыі (кіраўнік Віктар Роўда) добра справіліся з цяжкай партытурай, дамаглі неабходнай дакладнасці і кампактнасці гучання, а ў радзе выпадкаў — вялікай напружанасці і бляску.

«Альпійская сімфонія-балада» прагучала напярэдадні вялікага свята 50-годдзя Кастрычніка. Думаецца, што ў хоры святочных твораў, выконваемых у гонар юбілею, будзе ясна чуваць і яна, суровая і мужная, прысвечаная векапомнаму мінуламу.

Ніна ЮДЗЕНІЧ.

СЯБРАМ РОДНАГА СЛОВА

У арганізацыі літаратурных вечароў і пісьменніцкіх выступленняў, прысвечаных 50-годдзю Вялікага Кастрычніка, актыўны ўдзел прынялі шматлікія аматары роднага мастацкага слова — бібліятэкары, чытальнікі твораў беларускіх пісьменнікаў, пазаштатныя і грамадскія нарасгандэнты-арганізатары Бюро прапаганды мастацкай літаратуры Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Напярэдадні 50-годдзя Савецкай дзяржавы Бюро прапаганды вырашыла адзначыць лепшых з іх. Прэміраваны чытальнікі твораў беларускай літаратуры — дыпланты рэспубліканскага фестывалю самадзейнага мастацтва: Н. Бакей — метадыст Навасельненскага Дома культуры Дзятлаўскага раёна, М. Бяленка — калгасніца калгаса «Зара» Дзятлаўскага раёна, Р. Радомскі — урач Лепельскай раённай бальніцы, І. Гарэцкі — інжынер Мінскага аўтамабільнага завода, З. Лейфман — метадыст Краснапольскага раённага Дома культуры.

Бюро прапаганды мастацкай літаратуры Саюза пісьменнікаў Беларусі таксама аб'явіла падзяку дваццаці тром актыўным прапагандыстам беларускай літаратуры, сардэчна падзішаваўшы іх са слаўным 50-годдзем Вялікага Кастрычніка.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

31 кастрычніка

Першая праграма. 11-00 — тэлевізійныя навіны (М). 11-15 — «Летапіс паўвеку». Тэлевізійны шматсерыйны дакументальны фільм «Год 1950-ы» (М). 16-35 — праграма перадач. 16-40 — «Падзеі дня». Выпуск навін. 16-45 — «Слухай нас, Радзіма!». Рапарт піянеры. Перадача з г. Горкага. 17-00 — для юнацтва. «Шукальнікі». Тэлевізійны клуб (М). 17-55 — «Чытаючы Тэзісы ЦК КПСС». Тэлевізійны плакат (М). 18-00 — тэлевізійныя навіны. 18-20 — «Сёння і заўтра блакітнага экрана». На пытанні тэлегледачоў адказвае начальнік радыёўпраўлення Міністэрства сувязі БССР Л. У. Касцюшка. 18-30 — для слухачоў школ асноў марксізма-ленінізма. «Палітэканомія сацыялізма». «Характар працы пры сацыялізме» (М). 19-00 — для школьнікаў. «Родная Беларусь». Тэлевізійная віктарына. Падвядзенне вынікаў. 19-35 — «Летапіс паўвеку». Тэлевізійны шматсерыйны дакументальны фільм. «Год 1950-ы» (М). 20-30 — тэлевізійныя навіны (М). 21-00 — Ю. Герман. «Англія». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. Перадача з Ленінграда. 22-15 — «Турнір дапытлівых».

Для студэнтаў вну. 23-00 — «Тэхналогія металаў». 23-30 — «Вышэйшая матэматыка». 2 курс.

1 лістапада

Першая праграма. 11-40 — тэлевізійныя навіны (М). 11-55 — «Адна гадзіна з жыцця Радзімы». СССР — 1 лістапада 1967 г. (М). 13-05 — для юнацтва. «Шукальнікі» (М). 16-45 — праграма перадач. 16-50 — «Слухай нас, Радзіма!» Рапарт піянеры. Перадача з Алма-Аты. 17-05 — для школьнікаў. «Беларускія пісьменнікі». Паўлюк Трус. 17-35 — для дзяцей. «Самы, самы, самы, самы». Мультыплікацыйны фільм (М). 17-55 — «Чытаючы Тэзісы ЦК КПСС». Тэлевізійны плакат (М). 18-00 — «Юбілейны салют Кастрычніку». Выпуск «Беларускай панарамы». 18-20 — «Музычны маяк» (М). 18-30 — «Рэвалюцыйны марш навук». Выступленне прэзідэнта АН СССР акадэміка М. В. Келдыша (М). 19-00 — першынство СССР па хакеі. ЦСКА — «Дынамо» (Масква) (М). У перапынку — тэлевізійныя навіны (М). 21-35 — «Адна гадзіна з жыцця Радзімы». СССР—1 лістапада 1967 г. (М). 22-40 — тэлевізійныя навіны. Спецыяльны выпуск (М). 23-00 — «Наследнікам «Беларускай хаткі». Музычны агляд.

2 лістапада

Першая праграма. 14-55 — «Наш Ленін» (М). 16-40 — праграма перадач. 16-45 — «Слухай нас, Радзіма!» Рапарт піянеры. Перадача з Тбілісі. 17-00 — для школьнікаў. «У некаторым царстве, у некаторым гасударстве». Прэм'ера тэлевізійнага музычнага фільма (М). 17-55 — «Чытаючы Тэзісы ЦК КПСС». Тэлевізійны плакат (М). 18-00 — «Свет сёння». Міжнародная праграма (М). 18-30 — «На музычнай хвалі». 18-40 — «Юбілейны салют Кастрычніку». Выпуск «Беларускай панарамы». 19-00 — да 50-годдзя Савецкай улады. «У сузор'і брацкіх рэспублік». 19-40 — «Начальнік Чукоткі». Мастацкі фільм. 21-10 — «Некалькі парад». Выступленне прафесара Д. В. Палецкі. 21-25 — «Сем колераў вясёлкі». Кандэрт Дзяржаўнага ансамбля танца БССР. Прэм'ера музычнага фільма Беларускага тэлебачання. 22-20 — тэлевізійны тэатр мініяцюр. «Добры вечар!» (М).

Для студэнтаў тэхнікумаў. 23-20 — «Дэталі машын». 23-55 — «Тэарэтычная механіка».

3 лістапада

Першая праграма. 9-50 — урачыстае пасяджэнне ЦК КПСС, Вярхоўных Саветаў СССР і РСФСР у азнаменаванне 50-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Трансляцыя з Крамлёўскага Палаца з'ездаў (М). 15-20 — праграма перадач. 15-25 — «Юбілейны салют Кастрычніку». Выпуск «Беларускай панарамы». 15-45 — «Чытаючы Тэзісы ЦК КПСС». Тэлевізійны плакат (М). 15-50 — урачыстае пасяджэнне ЦК КПСС. Вярхоўных Саветаў СССР і РСФСР у азнаменаванне 50-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Трансляцыя з Крамлёўскага Палаца з'ездаў (М). Пасля заканчэння — тэлевізійныя навіны (М). 19-00 — святочны канцэрт. Перадача з Крамлёўскага Палаца з'ездаў (М). У перапынку — тэлевізійныя навіны. Спецыяльны выпуск (М). 22-00 — «Эстафета навін» (М). 23-00 — «Песні баявой маладосці». Канцэрт.

ВЫПРАЎЛЕННЕ ПАМЫЛКІ

У мінулым нумары нашай газеты дапушчана памылка. Падзаголовак да даклада «З адказнасцю перад нашым заўтра» трэба чытаць: «Даклад В. Аладава, старшыні праўлення Саюза архітэктараў Беларусі».

Наступны нумар газеты «Літаратура і мастацтва» выйдзе 4 лістапада 1967 года.

Лістападаўскі ЭКРАН

Кадр з фільма «Жалезны паток».

Новы шыроказкранны фільм «Цыган» пастаўлены рэжысёрам Яўгеніем Мацвееўым на кінастудыі імя Даўжэнкі. Гэта — экранізацыя аднайменнага твора Анатоля Калініна. Галоўныя ролі выконваюць Яўген Мацвееў, Людміла Хіцяева, Сяргей Ярмілаў, Таццяна Грабоўская, Кацярына Максімава.

У лістападзе будзе дэманстравацца таксама новая эстонская мастацкая кінаапавесць «Паўдзённы паром» (аўтар сцэнарыя Юхан Смуул, рэжысёр-пастаноўшчык Кальо Кійск) і новы мастацкі фільм «Дай лапу, Друг!», створаны рэжысёрам Ільём Гурыным на Маскоўскай кінастудыі імя Горкага (сцэнарый Юрыя Германа).

Складаны працэс фарміравання стыхійнай рэвалюцыйнай масы ў высокадысцыплінаваную армію паказаў у сваім рамане «Жалезны паток», выдатны савецкі пісьменнік Аляксандр Серафімовіч. Рэжысёр Яфім Дзіган экранізаваў на студыі «Масфільм» гэты твор.

— Як і Серафімовіч, — расказвае Я. Дзіган, — мы не ставілі сваёй задачай паказаць гістарычную хроніку аб Таманскай арміі. Мы адбіралі галоўныя, істотныя моманты паходу, бо галоўным для нас было — перадаць дух эпохі, характары, вобразы герояў літаратурнага твора, раскрыць вытокі рэвалюцыйнага энтузіязму народных мас, іх гераічную стойкасць і вернасць вялікай справе рэвалюцыі.

У галоўных ролях у фільме здымаліся Мікалай Аляксееў, Леў Фрычынскі, Мікалай Дзянісенка, Уладзімір Іваноў, Якаў Гладкіх, Ніна Алісава.

...У рэвалюцыйнай барацьбе рабочыя Піцера заўсёды былі наперадзе. У маі 1901 года на Абухаўскім заводзе адбылося выступленне, якое ўпершыню ў Расіі прыняло характар магутнай палітычнай дэманстрацыі. Гэтыя падзеі ўзноўлены ў фільме «Мяцежная застава», які Адольф Бергункер зняў на «Ленфільме» па сцэнарыі Аляксандра Уласава і Аркадзія Млодзіка.

У карціне заняты Барыс Чыркоў, Алег Барысаў, Аляксей Эйбажэнка, Ксенія Мініна.

У лістападзе на экраны рэспублікі выпускаецца чацвёртая серыя каляровай шырокафарматнай кінаэпапеі «Вайна і мір» — «П'ер Бязухаў». Гэта заключны акорд вялікага кінаапавядання, якое славіць патрыятызм, доблесць і мужнасць народа ў барацьбе з нашэсцем Напалеона. У галоўных ролях у чацвёртай серыі фільма здымаліся Людміла Савельева, Сяргей Бандарчук, Вячаслаў Ціханаў, Віктар Станіцын, Барыс Захава, Уладзіслаў Стржэльчык, Ірына Губанава.

Пра барацьбу за ўстанаўленне Савецкай улады ў Сярэдняй Азіі раскажуць новы таджыкскі мастацкі фільм «Здрада» і казахскі — «Трывожная раніца».

...Дзейнічаючы пад імем нямецкага афіцэра Паўля Зіберта, савецкі разведчык Мікалай Кузняцоў пранік у рэзідэнцыю намесніка Гітлера на Украіне Эрыха Коха. Ён выкраў і даставіў у партызанскі атрад нямецкага генерала фон Ільгена, расстраляў ката Украіны вярхоўнага суддзю Альфрада Функа, папярэдзіў савецкае камандаванне аб наступленні фашыстаў у раёне Курскай дугі і падрыхтоўцы замаху на ўдзельнікаў Тэгеранскай канферэнцыі. Легендарнаму савецкаму разведчыку прысвечана новая кінастужка «Моцныя духам», створаная на Свярдлоўскай кінастудыі рэжысёрам Віктарам Георгіевым па кнізе Дзмітрыя Мядзведзева. У ролі Мікалая Кузняцова здымаўся ў фільме заслужаны артыст Латвійскай ССР Гунар Цылінскі. У астатніх ролях заняты Іван Пераверзеў, Вікторыя Фёдарава, Яўгеній Веснік, Юрый Багалюбаў, Вія Артмане.

Гераічнаму жыццю і дзейнасці савецкіх разведчыкаў у гады Вялікай Айчыннай вайны прысвечана і новая малдаўская кінастужка «Марыяна». Фільм створаны рэжысёрам Васілём Паскару па аповесці Праскоўі Дзідык «У тыле ворага».

Кадр з фільма «Паўдзённы паром».

Кадр з фільма «Вайна і мір» (4 серыя).

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН (намеснік галоўнага рэдактара), А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22 04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда».

Індэкс 63856. АТ 13681